БУКВАР З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ

5

«БРЫЛЬЯНТЫ» Ў НЫРКАХ

21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ВЕРАСНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 169 (29538)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр інфармацыі:

«Святу беларускага пісьменства ўжо не адзін дзясятак гадоў, і мы ганарымся гэтай традыцыяй. Насамрэч у сучаснай незалежнай Беларусі не так шмат свят, супараўнальных са шматвекавымі традыцыямі іншых краін. Сучасныя звычаі — каштоўнасці, якія мы не можам страціць і якія павінны па крупінках збіраць і прымнажаць».

КАРАТКА

- **Найбольшы рост прамысловай вытворчасці ў ЕАЭС у студзені—ліпені зафіксаваны ў Беларусі.**
- Чатыры беларускія ВНУ трапілі ў рэйтынг найлепшых універсітэтаў свету: БДУ, БДУІР і два медыцынскія ў Гродне і Віцебску.
- **Новы сезон у Вялікім тэатры 8 верасня адкрые опера «Дзікае паляванне караля Стаха».**
- У Беларусі за пяць гадоў будзе пабудавана каля тысячы кіламетраў газаправодаў.
- **У ЕЭК заклікалі грамадзян урэгуляваць да 30 верасня статус увезеных да пандэміі аўтамабіляў.**
- Брэсцкая абласная бальніца ў гэтым годзе пачне рэканструкцыю сваёй фабрыкі па вытворчасці кісларoду.
- **Дагавор аб агульным рынку газу краіны ЕАЭС могуць падпісаць у 2022 годзе.**
- Баранавіцкі КЖБК за І паўгоддзе больш чым у 12 разоў павялічыў выпуск будаўнічага раствору.

ISSN 1990 — 763X

Пасля ўрокаў

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Дзеці і дарослыя гуляюць у футбол. Жодзіна.

Напярэдадні

САЎНДТРЭКІ І QR-КВЭСТ: чым здзівіць Капыль падчас Дня беларускага пісьменства?

Да Дня беларускага пісьменства засталося ўсяго некалькі дзён. Ужо 4 верасня Капыль прыме шматлікіх гасцей і ўдзельнікаў з розных куточкаў Беларусі. Спіс запланаваных мерапрыемстваў вялікі, таму даволі складана абраць найбольш цікавыя. Падчас фінальнай прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да свята, спікеры ўсё расклалі па паліцах і распавялі аб асноўных кірунках фестывалю. Акрамя гэтага, удзельнікі прыадчынілі заслону таямніцы: наступны, XXIX Дзень пісьменства пройдзе ў Добрушы.

— У ходзе падрыхтоўкі да свята Капыль значна абнавіўся, — адзначыў **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ.** — Горад стаў больш камфортным, зручным і прыгожым. Аб'екты раённага цэнтра прыведзены ў сучасны, цывілізаваны стан.

Удзельнікі мерапрыемства распавялі, што спецыяльна да фестывалю горад упрыгожылі тэматычнымі 3D-мураламі, прысвечанымі таленавітым ураджэнцам Капыля. Малюнкі адмыслова размясцілі на будынку пошты, каб сыгралі ўсе візуальныя эфекты.

Па словах Уладзіміра Пярцова, у Дня беларускага пісьменства ёсць некалькі канцэпцый, якія і сфарміравалі агульнае аблічча фестывалю.

— Асноўны, стрыжневы кірунак свята — гэта, вядома ж, Год народнага адзінства. Таксама будуць гучаць і такія тэмы, як гісторыка-культурная спадчына Капыля, 80-годдзе з пачатку Вялікай Айчыннай вайны і юбілеі класікаў беларускай літаратуры — Івана Шамякіна, Максіма Багдановіча, Кандрата Крапівы.

СТАР. 4

Сыны малой радзімы

СЛЕД НА ЗЯМЛІ

Збіральніку і папулярызатару роднага слова, фальклору, народнай мудрасці ў Івацэвіцкім раёне Алесю Зайку далі званне ганаровага грамадзяніна пасмяротна. Тры гады таму ён пайшоў з жыцця

Вось так бывае: чалавека ўжо даўно няма з намі, а кнігі, створаныя ім, выходзяць. Праводзіцца добраўпарадкаванне каля валуноў з мемарыяльнымі дошкамі ў мясцінах, ім апісаных, увекавечваецца слова, знойдзенае і клапатліва захаванае няўрымслівым збіральнікам. Пра такіх кажуць, што справа яго жыве. Справа, якой былы вясковы настаўнік Алесь Фаміч Зайка прысвяціў усё жыццё.

СТАР. 19

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Прыярытэтным кірункам бачым сумесную работу дзяржаў па далейшай лібералізацыі гандлю паслугамі»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на Глабальным саміце гандлю паслугамі ў Пекіне. Форум, прысвечаны лічбавым тэхналогіям, праходзіць у анлайн-фармаце.

Па словах Прэзідэнта, за гады дружбы Беларусі і Кітая неаднаразова пераконваліся ў паслядоўнасці палітыкі Пекіна, які аб'яднаў многа дзяржаў у рамках ініцыятывы «Пояс і шлях» на ўмовах справядлівага, раўнапраўнага, узаемавыгаднага супрацоўніцтва.

«Больш за тое, перажытыя ўзрушэнні, абумоўленыя пандэміяй і іншымі глабальнымі выклікамі, толькі ўмацавалі яго. Правядзенне выстаўкі ў гэты няпросты час — вельмі важны і сімвалічны крок Кітайскай Народнай Рэспублікі. Бо закрыццё граніц, зніжэнне турыстычнай актыўнасці, разрыў лагістычных ланцужкоў і рост пратэкцыянізму, каласальны націск на сістэму аховы здароўя, адмена міжнародных культурных мерапрыемстваў сталі беспрэцэдэнтным выпрабаваннем для рынку паслуг», — сказаў Аляксандр Лукашэнка ў сваім відэазвароце.

Але пры гэтым крызіс стымуляваў бум лічбавых тэхналогій і паслужыў свайго роду імпульсам для якаснай перазагрузкі традыцыйнай сферы паслуг. Як мяркуе кіраўнік краіны, у гэтым кантэксце ўражвае перадавы вопыт Кітая па развіцці і ўкараненні паслуг дыстанцыйнай адукацыі, анлайн-дыягностыкі і лячэння, прымяненні лічбавых тэхналогій у галіне турызму.

«Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу нарошчванню экспарту і імпарту паслуг. Разлічваем на пашырэнне супрацоўніцтва з Кітаем у гэтай сферы як адным з ключавых партнёраў нашай краіны. У якасці прыярытэтнага кірунку бачым сумесную работу дзяржаў па далейшай лібералізацыі гандлю паслугамі, ліквідацыі бар'ераў, прыцягненні інвестыцый», — дадаў Прэзідэнт.

Ён канстатуе, што рост глабальнай электроннай камерцыі стаў эфектыўным рэсурсам для аднаўлення эканамічнага росту, і Беларусь бачыць вялікія перспектывы ў выхадзе на кітайскія анлайн-пляцоўкі для прасоўвання паслуг у сферах адукацыі, турызму, медыцыны. Таксама, заявіў Аляксандр Лукашэнка, краіны павінны актывізаваць распрацоўку мер для павелічэння аб'ёму турыстычных паслуг.

«У заключэнне хацеў бы падкрэсліць, што мы працягнем рабіць свой унёсак у найхутчэйшае аднаўленне сусветнай эканомікі і развіваць разнапланавае і ўзаемавыгаднае міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы паслуг у інтарэсах нашых краін і народаў», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Міжнародны форум па гандлі паслугамі CIFTIS — найбуйнейшая ў Кітаі экспазіцыя ў гэтай галіне. Яна праходзіць у Пекіне з 2012 года. Экспазіцыя CIFTIS-2021 асвятляе пытанні лічбавай эканомікі, вуглярроднай нейтральнасці, а таксама прафілактыкі эпідэмій.

УЛАДА НА СУВЯЗІ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 4 верасня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

Тэлефонныя лініі ў гэтую суботу з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама **АЛЬШЭЎСКІ Вадзім Іванавіч** (80162213121);
- першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама **МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч** (80212222222);
- старшыня Гомельскага аблвыканкама **САЛАВЕЙ Генадзь Міхайлавіч** (80232331237);
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама **НЯВЕРА Віталь Іосіфавіч** (80152735644);
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама **СТРАХАР Руслан Барысавіч** (80222501869);
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама **КУРЛЕНКА Дзяніс Мікалаевіч** (80175004160);
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама **ТРУШЧАНКА Юрый Уладзіміравіч** (80172224444).

Парламенцкі дзённік

МОЛАДЗІ ЦІКАВА

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ сустрэлася з вучнямі 10 класа сталічнай гімназіі № 16. Знаёмства дэпутата з моладдзю было прымеркавана да Дня ведаў і прайшло ў сценах ніжняй палаты беларускага парламента.

«Дзень ведаў ужо стаў добрай традыцыяй, што нашы дзяржаўныя органы прымаюць у сваіх сценах тых, хто вызначаецца з будучыняй, з выбарам прафесіі, увогуле, з разуменнем: што адбываецца ў дзяржаве, па якіх правілах, па якіх законах мы жывём і хто працуе з гэтым, — пракаментавала парламентарый вынікі сустрэчы. — Сёння ў Палаце прадстаўнікоў праведзены ўрок ведаў з вучнямі, выпускнікамі адной з гімназій. Вельмі прыемна, што той, хто сюды прыйшоў (а магчыма ж, нехта з іх будзе працаваць тут праз пяць гадоў альбо трохі больш), цікавіцца: якія сёння законы, якія змяненні чакаюцца ў жыцці, асабліва маладых людзей. Іх пытанні, якія датычацца сацыяльнай абароны, маладзёжнай палітыкі, эканамічнага развіцця дзяржавы, сведчаць пра тое, што моладзь сёння дастаткова развітая і з ёй неабходна абмяркоўваць жыццёвыя пытанні, бо гэта — наша агульнае жыццё».

Дэпутат адзначыла адзінства падыходу тых, хто працуе ціпер (у тым ліку ў Палаце прадстаўнікоў), і тых, хто пакуль стаіць перад выбарам прафесіі.

«Гэта паказчык таго, што ў будучыні мы зможам рэалізаваць тыя задачы, якія стаяць у нашай дзяржаве», — лічыць старшыня парламенцкай камісіі.

Святлана Любецкая расказала школьнікам аб ролі інстытута парламентарызму ў забеспячэнні стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і актуальных задачах дэпутацкага корпуса.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Слова дэпутата

Гістарычна абгрунтаванае свята

Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Леанід БРЫЧ:

— Думаю, што мы яшчэ да канца не ўсвядомілі, наколькі важная дата для беларускага народа стала цяпер дзяржаўным святам. Так склалася, што мы, маю на ўвазе шырокія колы грамадскасці, крышачку забыліся пра дзень 17 верасня, пра аб'яднанне дзвюх частак Беларусі, якое адбылося ў 1939 годзе. Вядома, дзецям расказвалі пра тыя падзеі на ўроках гісторыі, але, відаць, не асабліва засяроджваючыся, нібы крыху мімаходзь. Сёння ў гарадах, пасёлках Заходняй Беларусі ёсць вуліцы 17 Верасня. Але яшчэ паўгода таму, калі б спыніў побач з шыльдай юнака ці дзяўчыну і спытаў, чаму так названа вуліца, не ўпэўнены, што многія адказалі б правільна. І за гэта, несумненна, адказнае старэйшае пакаленне.

Як вядома, указаную дату ў Беларусі святкавалі афіцыйна да 1949 года. А потым пакрысе мерапрыемствы станавіліся меншыя, непрыкметныя, адным словам, пра падзею сталі забывацца. Зразумелыя вытокі такой палітыкі: нашы папярэднікі не хацелі засяроджваць увагу на гістарычным факце, каб не нагадваць суседзям пра не самыя лепшыя старонкі гэтай самай гісторыі. Але ж, як пакалелі падзеі апошняга часу, нічога не варта забываць са свайго мінулага. І перш за ўсё для таго, каб не паўтарылася.

А падзея, што адбылася 17 верасня больш за 80 гадоў таму, сапраўды знакавая для краіны. Тыя 4 мільёны чалавек, што далучыліся да нас тады, разам з другой паловай насельніцтва сталі адзіным народам. І мы, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, рэлігій, культур, жывём у міры і згодзе многія гады. Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца, ёсць што святкаваць. А Дзень народнага адзінства не за адзін год стане сапраўдным святам. Паступова будуць нараджацца традыцыі, формы святкавання, вымалююцца найбольш прымальныя мерапрыемствы, будзе прыцягвацца ўсё больш дзяцей, моладзі, і свята зойме сваю пачэсную нішу ў шэрагу іншых дзяржаўных свят нашай краіны.

Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ААН: Афганістан стаіць на мяжы гуманітарнай катастрофы

Каардынатар гуманітарнай дапамогі ў Афганістане па лініі ААН Раміз Алакбараў заявіў, што Афганістан стаіць на мяжы гуманітарнай катастрофы, паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН.

Як падкрэсліў Раміз Алакбараў, ААН і яе партнёры працягваюць рабіць усё магчымае, каб пазбегнуць гуманітарнай катастрофы, аднак для гэтага арганізацыі патрабуецца сур'ёзная міжнародная падтрымка. Прадстаўнік ААН паведаміў: у краіне, якая перажыла жорсткую засуху, галоўная праблема — недахоп харчавання. Больш за палову афганцаў не ведаюць раніцай, ці ўдасца ім сёння паесці, у краіне не хапае і медыкаментаў.

Аэрапорт Кабула закрыты, але ААН і яе партнёрскія арганізацыі знаходзяць іншыя шляхі адпраўліць дапамогу. У краіну ўжо дастаўлена каля 600 тон харчавання. Яно асабліва патрэбна дзецям, палова якіх хутка апынецца на мяжы знясілення. Гуманітарныя супрацоўнікі таксама дапамагаюць згубленым, у тым ліку ў аэрапорце, дзецям уз'яднацца са сваімі блізкімі.

Адзначаецца, што, як бы ні працавалі работнікі ААН і іх калегі з іншых арганізацый, іх магчымасці несупастаўныя з маштабамі патрэб. Яшчэ да захопу ўладаў талібамі ААН прасіла міжнародную супольнасць даць на дапамогу Афганістану $1,3 млрд. На сёння атрымана толькі $400 млн.

Як адзначыў прадстаўнік ААН, талібы абяцалі не перашкаджаць арганізацыі дастаўляць дапамогу людзям, аднак канкрэтная сітуацыя на месцах залежыць ад розных фактараў.

У сетцы высмеялі візіт Зяленскага ў ЗША

Карыстальнікі ўкраінскага агенцтва УНІАН раскрытыкавалі прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага, які пасля сустрэчы з амерыканскім калегам Джо Байдэнам прызнаўся, што забыўся абмеркаваць з ім ягоны візіт у Кіеў. Украінскі лідар зараз знаходзіцца з рабочым візітам у ЗША.

«Хто б сумняваўся, «палітык», — абурыўся карыстальнік Юрый Кліменка.

«А на піяніна сыграць не забыўся!» — зыранізаваў Дзмітрый Токараў.

«Без слёз немагчыма чытаць прамовы Зяленскага! Набор слоў! Гэта жах! Гэты чалавек кіруе краінай», — адзначыла Zosia Fedchuk.

«Ой, па галоўцы пагладзіў, грошыкаў даў, а чаго яшчэ прымітыўнаму піяністу з «Квартала» трэба...» — падсумавалі чытачы.

Раней кіраўнік Белага дома заявіў, што спадзяецца аднойчы зноў наведаць Украіну, куды прыязджаў у 2017 годзе. У краіне ён апошні раз быў у якасці віцэ-прэзідэнта перад сыходам з пасады Барака Абамы.

Пенсіянерка раздала ўсе грошы, якія выйграла ў латарэю

72-гадовая пенсіянерка з Дэрбішыра (Англія) Кэт Скот выйграла 140,9 тысячы фунтаў стэрлінгаў (больш як 150 тысяч долараў) у паштовай латарэі і раздала ўсе грошы праз некалькі гадзін, паведамляе Daily Mirror.

Падчас пандэміі Скот дапамагала мясцовым урачам: яна пашыла сотні медыцынскіх халатаў для работнікаў бальніц і дамоў састарэлых. «Гэта была цяжкая праца, але гэта не мела значэння: я ведала, што ўсе мае намаганні пойдуць на добрую справу», — расказала брытанка.

Частку выйграных у латарэю грошай Скот патраціла на пакупку і ўстаноўку дэфібрылятара ў мясцовае аддзяленне пошты. Яна таксама вырашыла падзяліцца выйгрышам з унукамі. Муж брытанкі Алан пакутуе на хваробу Паркінсана, таму яны не змогуць адправіцца ў падарожжа і вырашылі патраціць грошы на дапамогу іншым.

Раней паведамлялася, што жыхар амерыканскага штата Паўднёвая Караліна за два тыдні двойчы перамог у латарэі — з розніцай у адзінаццаць дзён.

Энергіі і інтэлекту час, славуты Мінск, ты выбіраеш нас!

Як сталіца сустрэне свой 954-ы дзень нараджэння

Адным з самых любімых і папулярных свят у нашай краіне па праве лічыцца Дзень горада. Любы горад індывідуальны па-свойму — гісторыяй і культурай, падзеямі, працоўнымі, творчымі, спартыўнымі і іншымі дасягненнямі. У дзень правядзення свята Дня горада сёлета можна будзе адчуць часцінку душы мінчукоў, іх настрой і стаўленне да самога горада.

Усе намаганні арганізатараў свята накіраваныя на тое, каб паказаць усё найлепшае, чаго дамогся, чым славіўся і славіцца цяпер горад-герой Мінск. Гарадское свята 2021 года імкнуцца зрабіць найбольш яркім, запамінальным і асаблівым, вясёлым і запальным, незвычайным і цікавым для гасцей горада і самі жыхароў.

У суботу, 11 верасня, мы адзначым 954-ы дзень горада ў Мінску, у сувязі з чым гарадскія ўлады падрыхтавалі для актыўных мінчукоў цікавую праграму. Урачыстая дата насычана шматлікімі мерапрыемствамі. Прадстаўнікі адміністрацыі ўскладаюць кветкі да мемарыяльных аб'ектаў. Уручаюць узнагароды выбітным дзеячам. Культурныя ўстановы рыхтуюць тэматычныя выстаўкі. Музеі дэманструюць экспанаты, звязаныя з гісторыяй.

Выхаванцы спартыўных школ удзельнічаюць у паказальных выступленнях. Ладзяцца спаборніцтвы сярод футбольных каманд, весляроў, атлетаў. Тэатральныя калектывы прадстаўляюць спектаклі пад адкрытым небам. Народныя майстры перадаюць вопыт стварэння вырабаў. Арганізоўваецца фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Увечары на сцэну выходзяць папулярныя выканаўцы. У завяршэнне свята неба азараецца іскрамі феерверку.

Пляцоўкай асноўных гарадскіх мерапрыемстваў стане тэрыторыя каля Палаца спорту, дзе 10—12 верасня разгорнецца святочны кірмаш і пройдзе мноства відовішчных падзей. У пятніцу гандаль пачнецца ў 12.00, у суботу — ужо з 11.00, у нядзелю — з 9.00 і будзе доўжыцца да позняга вечара. А з поўдня 11 верасня ў шумны гандаль уварвуцца яшчэ і рытмы музычнага маладзёжнага фестывалю. Крыху пазней тут стартуе Міжнародны турнір па сіловым экстрыме Minsk Open Cup 2021, гарачыя спаборніцтвы за званне найлепшага зладзяць пажарныя-ратавальнікі.

Пляцоўка каля Верхняга горада 11 верасня прыцягне аматараў аўтэнтычнага народнага каларыту — тут пройдзе XII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. А ўвечары знаўцы класікі нацешацца сімфоніяй гукаў ад Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі.

Завершыць асноўны дзень святкаванняў 11 верасня маляўнічае піратэхнічнае прадстаўленне ў скверы Старасцінская Слабада ў 22.00.

Асноўным лейтматывам нядзелі стануць спорт і творчасць для ўсіх. Доўгачаканы Мінскі паўмарафон стартуе ад Палаца спорту ў 9.00 і абяцае быць вельмі масавым. А ў Палацы культуры правіць баль будуць музы мастацтва: тут пройдзе гарадскі фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі, але неабсяжнымі марамі, фантазіяй і талентамі — «Мастацтва жыць, тварыць мастацтва».

Яшчэ напярэдадні, 1 верасня, у сталічных школах прайшлі гасцявыя ўрокі «Я — мінчанін», а з 6 верасня пачнуцца інфармацыйна-выхаваўчыя гадзіны, дыскусійныя пляцоўкі. Не абыдзецца і без адкрыцця Вахты памяці на пасту № 1 горада-героя Мінска — на плошчы Перамогі. 11 верасня падножжа манумента будзе выслана кветкамі ад удзячных за мір нашчадкаў.

Паралельна ў гарадскіх бібліятэках будуць ладзіцца розныя тэматычныя сустрэчы, на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах, інтэрнэце пройдзе агульнагарадская акцыя па папулярызацыі дзяржаўных сімвалаў Беларусі «Сімвалы маёй краіны і майго горада». А ў кінатэатрах 10—12 верасня пакажуць дакументальныя стужкі пра Мінск з калекцыі кінастудыі «Беларусьфільм».

Кіраўніцтва Мінгарвыканкама сустрэнецца 9 верасня ў ратушы з членамі савета старэйшын і ганаровымі грамадзянамі горада, дзе на наступны дзень адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўшанавання мінчан, якія актыўна ўдзельнічаюць у ахове грамадскага парадку і прафілактыцы правапарушэнняў.

У дзяржаўным маладзёжным тэатры 10 верасня ордэн Маці ўручаць некалькім шматдзетным мінчанкам. А ў парку Янкі Купалы 11 верасня пройдуць цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года», «Найлепшы па прафесіі» і святочны канцэрт.

У Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага 11 верасня ўрачыста сустрэнуць хлопцаў, якія вярнуліся з «Зорнага паходу», узнагародзяць пераможцаў конкурсу «Формула саду». У Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі пройдзе маштабнае свята для ўсіх маленькіх гараджан.

У кожным адміністрацыйным раёне сталіцы рыхтуюцца і свае гулянні. Будзе шмат весялосці і шуму, смачных пачастункаў, музыкі, танцаў. Святы дварою, квэст-гульні, дзіцячыя спаборніцтвы на роварах, кубак па сілавых відах спорту, конкурсы малюнкаў, фестывалі дзіцячай творчасці, турыстычны спрынт, фотавыстаўкі і выстаўкі мастацкіх рамёстваў — гэта і не толькі чакае мінчукоў 11 верасня.

Акрамя таго, гэтымі днямі сваё 100-годдзе адзначыць БДУ, так што гараджан чакае яшчэ больш сюрпрызаў.

Мінск... Для многіх пакаленняў яго спакойныя вуліцы, шумныя праспекты і велічныя плошчы сталі роднымі. І для кожнага жыхара гэты горад асабліві, свой. Галоўнае ў свяце горада — гэта ўсмешкі на тварах гараджан. Якое за акном ні было б надвор'е і якія зорныя канцэрты ні падрыхтавалі б нам арганізатары, 11 верасня 2021 года можа стаць яшчэ лепшым, калі вы са сваімі роднымі і блізкімі прыйдзеце на свята Мінска ў добрым настроі.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Надвор'е

Вось і «дачакаліся» восені...

Першыя замаразкі — ужо ў выхадныя

Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Каляндарная восень у краіне стартавала сапраўдным восеньскім надвор'ем: шчыльныя слаістыя аблокі зацягваюць неба на большай частцы тэрыторыі Беларусі, аднаксі на тэрмометрах прымушаюць з сумам успамінаць летняе цяпло, а ў канцы гэтага і пачатку наступнага тыдня і зусім нас чакаюць першыя ў гэтым восеньскім сезоне замаразкі, інфармуе Белгідрамет.

У пятніцу, 3 верасня, захаваецца халаднаватае надвор'е, не дадасць камфорту і моцны парывісты вецер. Ноччу па поўначы, днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні парывісты, днём у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 градусаў вышэй за нуль, днём будзе ад плюс 13 па поўначы да 20 градусаў цяпла па поўдні краіны.

У выхадныя, 4—5 верасня, надвор'е ў Беларусі абумовіць няўстойлівая халодная паветраная маса, якая распаўсюджваецца з поўначы Еўропы. У суботу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 градусаў вышэй за нуль, днём — 11—17 градусаў цяпла.

У нядзелю ўначы пераважна без ападкаў, днём месцамі па Беларусі чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 градусаў вышэй за нуль, у асобных раёнах магчымы слабыя замаразкі ад нуля да мінус 1. Удзень будзе 10—17 градусаў цяпла.

На папярэдніх прагнозах сіноптыкаў, да сярэдзіны наступнага тыдня надвор'е ў Беларусі будзе фарміраваць халодны скандынаўскі антыцыклон, які перамяшчаецца на тэрыторыю Беларусі. Таму істотных ападкаў не чакаецца, а тэмпературны фон будзе нізкэйшы за належны па календары.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Экспазіцыі

«Гора ад розуму» на тэатральнай сцэне»

Часовая літаратурна-мастацкая экспазіцыя «Гора ад розуму» на тэатральнай сцэне» адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

«Адкрыццё гэтай выстаўкі — значная падзея для беларускай і рускай культуры, асабліва калі мы гаворым аб бессмяротнай камедыі Аляксандра Грыбаедава «Гора ад розуму». Ідэя з'явілася яшчэ ў мінулым годзе, калі мы падпісалі прапанову прывезці экспазіцыю з Дзяржаўнага гісторыка-культурнага і прыроднага музея-запаведніка А. С. Грыбаедава «Хмяліта», — расказала **загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Вольга ГУЛЕВА.** — Тут прадстаўлены практычныя ўсе рэдакцыі гэтай камедыі, пачынаючы з XIX стагоддзя, заканчваючы другой паловай XX стагоддзя. Са свайго боку мы вырашылі дапоўніць экспазіцыю беларускімі экспанатамі: можна ўбачыць афішу Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра 1963 года і, напрыклад, ужо больш сучасную — пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, якая ўжо больш за 10 гадоў радуе гледача. Вядома, акцёрскія склады мяняюцца, але «Гора ад розуму» жыве на тэатральнай сцэне, бо тыя праблемы, якія ўзнімаў Аляксандр Грыбаедаў, сапраўды хвалююць нас і сёння».

Паводле слоў першага сакратара Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Юліі Араевай, гэта вельмі незвычайны праект. «Дзіўна, што ў адным памяшканні сабралі столькі жамчужын: цудоўныя эскізы да тэатральных касцюмаў, фатаграфіі і выданні», — дадала яна.

Гасцям прадставілі гісторыі тэатральных пастановак «Гора ад розуму» на беларускай і расійскай сцэнах. На выстаўцы можна ўбачыць копіі рэдкіх фатаграфій — сцэны з камедыі ў пастаноўках 1836—1935 гадоў, эскізы дэкарацый і касцюмаў, фатаграфіі са спектакляў музычных і драматычных тэатраў.

На адкрыцці прагучалі ўрыўкі са спектакляў на рускай і беларускай мовах.

«Гора ад розуму» на беларускай сцэне» — сумесны праект Дзяржаўнага гісторыка-культурнага і прыроднага музея-запаведніка А. С. Грыбаедава «Хмяліта» і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Сярод удзельнікаў праекта — Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, Прэзідэнцкая бібліятэка Беларусі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага.

Наталля ДРАЗДОВА.

Падзея

МЫ — РАЗАМ!

У Мінску ў Верхнім горадзе 11 верасня адкрыецца XIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур

Падчас адкрыцця фестывалю з 12.00 да 17.00 пройдзе канцэртная праграма з удзелам творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў розных нацыянальнасцяў — беларусаў, азербайджанцаў, армян, афганцаў, башкіраў, грузін, дагестанцаў, яўрэяў, ірландцаў, італьянцаў, індыйцаў, карэйцаў, кітайцаў, літоўцаў, малдаван, немцаў, палякаў, палесцінцаў, рускіх, татараў, туркменаў, украінцаў, цыганоў, чувашоў, эстонцаў.

У якасці запрошаных гасцей у канцэрце прымуць удзел заслужаны калектыў Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі, Нацыянальны акадэмічны народны хор Беларусі імя Г. І. Цітовіча, салісты Беларускай дзяржаўнай філармоніі, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца «Дружба».

«На тэрыторыі Верхняга горада размесцяць выстаўку традыцыйных касцюмаў і прадметаў побыту нацыянальных культур, вырабаў народных рамёстваў Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, а рэстараны сталіцы прадставяць стравы нацыянальнай кухні», — дадалі арганізатары.

Плануецца, што ва ўрачыстым адкрыцці фестывалю прымуць удзел прадстаўнікі Мінкультуры, Мінгарвыканкама, пасольстваў замежных дзяржаў, а таксама старшыні нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў.

Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур праводзіцца ў два этапы. Першы — урачыстае адкрыццё і адборачныя туры ў рэгіёнах Беларусі. Кожны з іх прадстаўляе канцэртную праграму і выстаўкі з удзелам прадстаўнікоў нацыянальнасцяў, якія пражываюць у гэтым рэгіёне. Цяпер фарміруецца журы па жанравых кірунках: харэаграфія, вакал, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і інструментальная музыка.

Другі этап — заключныя мерапрыемствы ў Гродне. У першы дзень арганізуюць шэсце прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, святочны канцэрт з удзелам творчых калектываў нацыянальна-культурных аб'яднанняў і прафесійных артыстаў, а ў заключны дзень будуць працаваць нацыянальныя падворкі, пройдзе канцэрт-закрыццё фестывалю з узнагароджаннем удзельнікаў.

Разам мы — моцныя

РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ І ВЫЗНАЧЭННЕ ВЕКТАРА РАЗВІЦЦЯ

У глядзельнай зале наваполацкага Палаца культуры ААТ «Нафтан» у аўторак падчас рэгіянальнага форуму «Беларусь адзіная» не было свабодных месцаў. Да гэтага аналагічныя мерапрыемствы прайшлі ў Брэсцкай, Мінскай, Гомельскай абласцях.

З усіх раёнаў Віцебшчыны прыехалі ў горад нафтаперапрацоўшчыкаў, каб узяць удзел у форуме прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улад, бізнесу, грамадскіх арганізацый, СМІ, сістэм адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны. Яны штодня маюць зносіны з людзьмі розных узростаў, прафесій, палітычных поглядаў. Таму ім было што запытаць і пра што распавесці. Сустрэча не стала фармальным мерапрыемствам, бо адразу ўсіх прысутных спікеры папрасілі выказваць свае думкі, дыскутаваць, падказваць далейшы ход гутаркі.

Перад пачаткам форуму ахвотныя азнаёміліся з выстаўкай, прысвечанай гісторыі «Нафтана». Шмат прыемных эмоцый пакінула сустрэча з гараджанамі, якія працуюць у цэнтры рамёстваў, у прыватнасці ствараюць мэблю з лазы, шмат зрабілі для адраджэння традыцыі батлейкі, вучаць гэтаму дзяцей і моладзь. Вельмі спадабалася і прэзентацыя вырабаў тых, хто наведвае гурткі структур сацыяльнай абароны насельніцтва.

Галоўная мэта рэгіянальных форумаў, якія праводзяць у абласцях, — кансалідацыя грамадства. Мы жывём у краіне, якую трэба цаніць, рабіць моцнай — такі лейтматыў мерапрыемства ўсебеларускага маштабу. Шмат на ім гаворыцца і наконт новага ўзроўню інтэграцыі з Расіяй.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН падкрэсліў важнасць падпісання «дарожных карт» узаемадзеяння паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй. Дадзеная тэма сёлета і летась была магістральная, адзначыў ён.

«Інтэграцыя з Расіяй вядзецца з сярэдзіны 1990-х гадоў па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі. Праграма яе змяніла геапалітычную сітуацыю ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. І не таму, што гэта было выгадна беларусам, тады Расія была параўнальна слабая, з унутранымі супярэчнасцямі, — падзяліўся думкамі эксперт. — Інтуіцыя Аляксандра Лукашэнкі падказала, што нашы людзі вельмі хочуць быць бліжэй да Расіі».

Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, эканамічны аглядальнік Аляксей АЎДОНІН лічыць, што ўдзельнікі рэгіянальных форумаў «Беларусь адзіная» з'яўляюцца актывам, па заходняй тэрміналогіі — транзіцёрамі, якія прымаюць ідэю, потым яе трансліруюць у свае супольнасці. У сваіх калектывах ім трэба распавесці пра ключавыя канцэпцыі і бачанні, якія абмяркоўваюцца.

Член Канстытуцыйнай камісіі, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, палітычны аналітык Аляксандр ШПАКОЎСКІ закрануў тэму эканамічных санкцый з боку еўрапейскіх дзяржаў. На яго думку, яны не прывядуць да эканамічнага абвалу. Пры гэтым людзям трэба тлумачыць, хто вінаваты ў тым, што на сёння неабходна трохі карэкціраваць выплаты бюджэтнікам, а павышэнне пенсій адбываецца не ў такім памеры, як планавалася. Ён нагадаў пра дасягненні апошніх гадоў: адкрыццё АЭС, трэцяй лініі метро ў Мінску, узвядзенне Петрыкаўскага горна-ўзбагачальнага камбіната...

Як член камісіі, якая працуе над прапановамі па змяненні некаторых пунктаў Асноўнага Закона краіны, Аляксандр Шпакоўскі цікавіўся думкамі па дадзенай тэме. Трэба прынцыпова вызначыцца, які павінен быць новы орган дзяржаўнага кіравання прадстаўнічай дэмакратыі — Усебеларускі народны сход, акцэнтаваў увагу ён. Вельмі важнае пытанне: ці трэба адмяніць смяротнае пакаранне або ўвесці мараторый на яго выкананне? Сацыёлагі, па словах эксперта, сцвярджаюць, што беларусы пакуль выступаюць за захаванне смяротнага пакарання. Актуальная, на яго думку, таксама тэма магчымасці прэтэндаваць на дэпутацкія мандаты прадстаўнікам працоўных калектываў без працэдуры збору подпісаў. Справа ў тым, што каля паловы ўнутранага валавога прадукту ў Беларусі ўжо генерыруецца прыватным сектарам. Да 70 % будзе ў найбліжэйшай перспектыве. І гэта ўклад у асноўным невялікіх фірмаў, супрацоўнікі якіх зацікаўленыя, каб іх інтарэсы прадстаўлялі ў парламенце.

Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, публіцыст і філосаф Аляксей ДЗЕРМАНТ упэўнены, што ў жніўні мінулага года быў пройдзены Рубікон, які стаў чарговым этапам у развіцці Беларусі. Цяпер трэба зрабіць работу над памылкамі, лічыць спікер форуму. Прынцыповая пазіцыя ў адстойванні гістарычнай праўды, памяці, каштоўнасцяў — тое, чаму мы павінны навучыцца пасля 2020 года, каб не адбылося разбурэння фундамента грамадства, мяркуе ён.

Загадчык аддзела чалавечага развіцця і дэмаграфіі Інстытута эканомікі НАН Беларусі, кандыдат эканамічных навук, дацэнт Анастасія БАБРОВА упэўненая, што не бывае праблем маленькіх. І таму пацвярджэнне — падзеі мінулага года, калі жыццё даказала, што маленькія праблемы і незадаволенасць могуць парадзіць больш складаныя, якія ідуць за межы дапушчальнага.

Беларусь многаму можа навучыць іншыя краіны, у прыватнасці, у сферы лічбавізацыі. Ад кожнага з жыхароў краіны, моцных рэгіёнаў залежыць, як справіцца дзяржава з выклікамі. Важнае пытанне — роля жанчыны ў эканамічным, ідэалагічным і палітычным планах, падкрэсліла эканаміст.

Сярод тых, каго са сцэны папрасілі падзяліцца сваімі думкамі, быў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.** Ён як кіраўнік абласной арганізацыі «Белай Русі» паразважаў наконт магчымасці стварэння партыі ўлады на базе грамадскага аб'яднання. Рэгіянальны форум доўжыўся больш за тры гадзіны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.
Наваполацк.

САЎНДТРЭКІ І QR-КВЭСТ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета Дзень беларускага пісьменства атрымаецца сапраўды інтэрактыўным. Удзельнікі прэс-канферэнцыі распавялі адразу аб некалькіх лічбавых функцыях, якія будуць задзейнічаны падчас мерапрыемстваў. Па-першае, гэта QR-коды, размешчаныя на афішах фестывалю:

— Праз выкарыстанне лічбавых пляцовак мы імкнёмся прыцягнуць увагу моладзі да беларускай літаратуры. QR-коды будуць адсылаць карыстальнікаў да інфармацыі аб пісьменніках. Акрамя гэтага, упершыню пройдзе інтэрактыўны пешаходны QR-квэст «Капыльскі рог», падчас якога ўдзельнікі павінны будуць вырашыць лагічныя задачкі, — заінтрыгаваў міністр інфармацыі.

Другая, не менш цікавая інтэрактыўная опцыя, — мабільны дадатак для праслухоўвання аўдыякніг «Чытанка». На дадзены момант «Чытанка» ўжо працуе, даступная для спампоўвання і налічвае больш за 60 кніг беларускіх аўтараў. Лічбавыя магчымасці будуць выкарыстоўвацца і падчас мерапрыемстваў. Так, адкрыццё фестывалю пройдзе пад канцэпцыяй «Спевы дубраў»: на ўсталяваныя ЖК-экраны спраецыруюць прыродныя помнікі беларускай культуры. Экраны ўсталююць па перыметру залы, каб як мага найлепш паглыбіць удзельнікаў у «лясную» атмасферу.

Муралы з выявамі вядомых беларускіх пісьменнікаў з'явіліся на дамах Капыля напярэдадні свята.

— Закрыццё фестывалю таксама пройдзе ў фармаце, які выходзіць за межы простага канцэрта, — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Упершыню нас чакае арыгінальная падача: сімбіёз саўндтрэкаў з фільмаў, якія былі зняты па творах беларускіх аўтараў. Запланавана, што тэлеэфір свята выйдзе ў той жа дзень.

Спікеры праанансавалі і асноўныя мерапрыемствы Дня беларускага пісьменства.

Міжнародны круглы стол «Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора» ўпершыню пройдзе за межамі цэнтра свята. Сустрэча з экспертамі і аналітыкамі адбудзецца 3 верасня ў Мінску, такое рашэнне было прынята арганізатарамі з-за шэрагу прычын. Першая і асноўная — вялікі ажыятаж. У гэтым годзе шмат краін выказалі жаданне прыняць удзел у круглым стале. Плануецца, што акрамя беларускіх удзельнікаў, мы ўбачым прадстаўнікоў Расіі, Германіі, Украіны, Казахстана, Балгарыі, Малдовы, Літвы. І гэта далёка не канчатковы спіс. Каб забяспечыць стабільнае анлайн-падключэнне, сустрэча пройдзе ў канферэнц-зале Палаца Рэспублікі. Кожны ахвотны зможа паглядзець трансляцыю праз YouTube.

Навукова-практычная канферэнцыя «Капыльскія чытанні» адбудзецца 4 верасня. Як адзначыў **Ігар КАПЫЛОЎ, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа,** гэта традыцыйнае мерапрыемства, якое ладзіцца з першых дзён правядзення свята:

— Сёлета ўся тэматыка канферэнцыі будзе звязана з Годам народнага адзінства. Удзел возьмуць вядучыя вучоныя нашай краіны, у першую чаргу прадстаўнікі акадэмічных інстытутаў. Адметна, што ў нашай канферэнцыі вынікамі сваіх навуковых даследаванняў падзеляцца пісьменнікі і творчая інтэлігенцыя раёна. Канферэнцыя будзе мець некалькі блокаў: гістарычны, мовазнаўчы, літаратуразнаўчы. Акрамя гэтага, падчас «Капыльскіх чытанняў» адбудзецца прэзентацыя 23-томнага выдання твораў Івана Шамякіна.

Яшчэ адно знакавае мерапрыемства — Нацыянальная літаратурная прэмія. Цырымонія ўзнагароджання адбудзецца падчас урачыстага адкрыцця фестывалю. Уручаць прэмію будуць адразу ў шасці намінацыях: «Проза», «Паэзія», «Публіцыстыка», «Крытыка», «Дэбют» і «Лепшы твор» для дзяцей і юнацтва.

Нельга забывацца і аб сустрэчах з пісьменнікамі. Падчас свята адбудзецца творчы вечар старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца. Таксама будуць ладзіцца прэзентацыі і аўтограф-сесіі з Сяргеем Трахімёнкам, Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, Вячаславам Бандарэнкам.

Ігар Бузоўскі адзначыў, што на Дні беларускага пісьменства з вялікімі зніжкамі будуць прадавацца кнігі дзяржаўных выдавецтваў. Гэта было зроблена для папулярызацыі друкаваных версій.

Капыль сардэчна запрашае гасцей і гатовы іх сустракаць!

Арына КАРПОВІЧ.

Сучасны падыход

«БУКВАР» З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ і ўлікам узроставых асаблівасцяў

Кожны, мабыць, можа прыгадаць, з якім пачуццём браў у рукі свой першы «Буквар». Як адчуваў пах свежанадрукаванай кнігі, спяшаўся пагартаць яе, як вабіла таямніца слоў, што адкрывалася тады, калі зразумееш сэнс напісанага... З такой жа кніжкі, але зробленай па-новаму, цяпер будуць пачынаць знаёмства з літарамі, вучыцца чытанню і спазнаваць нашу краіну беларускія першакласнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Новы «Буквар» стварылі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, і ён мае шэраг адметнасцяў, а таксама карысных сюрпрызаў для будучых школьнікаў. Пра іх мы і распыталі аўтараў новага навучальнага дапаможніка Вольгу СВІРЫДЗЕНКУ і Вольгу ЦІРЫНАВУ.

— Мы вельмі стараліся, каб новы «Буквар» быў сучасным, прыгожым, пазнавальным, каб першакласнікам было цікава вучыцца па ім чытаць, каб ім хацелася гартаць гэтую кніжку зноў і зноў. Каб менавіта такім ён прыйшоў у школу, спатрэбілася праца многіх людзей: гэта і педагогі, з якімі мы абмяркоўвалі свае ідэі на рэспубліканскім семінары, і метадысты Нацыянальнага інстытута адукацыі, і рэцэнзенты вучэбнага выдання, і ўсе супрацоўнікі выдавецкага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі, рэдактары, мастакі, карэктары, — распавядае Вольга Свірыдзенка. — Нягледзячы на тое, што кожны з нас да напісання беларускага буквара ўжо меў вопыт падрыхтоўкі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, работа па стварэнні вучэбна-метадычнага комплексу «Навучанне грамаце» стала першым нашым сумесным праектам і мы засталіся задаволеныя супрацоўніцтвам, паколькі ў агульным праекце змаглі спалучыць найлепшыя ўласныя напрацоўкі.

Стваральнікі адзначаюць, што буквар як асобная кніга нясе ў сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял. Ён дапамагае першакласнікам спасцігаць галоўныя агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці: сяброўства, любоў да Радзімы, да сваякоў, клопат пра старэйшых і дапамога малодшым.

Так, у працэсе работы над «Букваром» аўтары сумесна пераадолвалі ўсе цяжкасці, звязаныя з тым, каб выконвалася асноўнае прызначэнне гэтай кнігі — навучыць дзяцей чытаць. З увядзеннем кожнай новай літары даводзілася вырашаць складаныя задачы, звязаныя з падборам слоў і стварэннем тэкстаў навучальнага і выхаваўчага характару. У новым буквары трэба было ўлічыць інтарэсы сучасных дзяцей, якія жывуць у інфармацыйнай прасторы і актыўна карыстаюцца электроннымі сродкамі яшчэ ў дашкольным узросце. Таму на старонках новага вучэбнага дапаможніка ідзе размова і пра камп'ютар, і пра Skype, і пра мабільныя тэлефоны, і пра інтэрнэт. Аднак яго стваральнікі імкнуліся данесці да сучаснага дзіцяці, што электронныя сродкі можна выкарыстоўваць не толькі для гульні, але і для навучання. Так з'явілася ідэя з прымяненнем QR-кодаў на старонках вучэбнага выдання.

— Паколькі мы добра ведаем узроставыя асаблівасці першакласніка і разумеем, што пераход ад гульнявой да вучэбнай дзейнасці адбываецца ў іх паступова, вучні яшчэ доўга не страчваюць цікавасці да цацак і мультфільмаў, улічылі гэта і ў рабоце над букваром, — дзеліцца Вольга Цірына-ва. — Таму серыя анімацыйных фільмаў «Беларуская азбука» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» стала той знаходкай, якая дапамагла нам у стварэнні электроннага кантэнту. Мы вельмі ўдзячныя кіраўніку «Беларусьфільма» Уладзіміру Карачэўскаму і яго супрацоўнікам: дырэктару студыі анімацыйных фільмаў Ігару Галіноўскаму, кінарэжысёрам-пастаноўшчыкам Канстанціну Андрушачкіну, Ірыне Тарасавай і Уладзіміру Пяткевічу за тое, што ў сучасным буквары з'явілася дапоўненая рэальнасць.

Думаю, бацькі, чые дзеці любяць мультфільмы, прыгадаюць дзяўчынку Кірыліцу, якая ў займальнай форме распавядае пра кожную з літар беларускага алфавіта. Гэты анімацыйны праект на «Беларусьфільме» стваралі на працягу некалькіх гадоў, і складаецца ён з чатырох фільмаў. Для вучэбнага дапаможніка іх разбілі на маленькія мультфільмы, кожны з якіх знаёміць з асобнай літарай у кніжцы.

— Пачынаў гэты анімацыйны праект Уладзімір Пяткевіч. Ён з'яўляецца рэжысёрам першых двух фільмаў. А потым работу над цыклам падхапіла я. З самага пачатку было зразумела, што ідэя ўвасобіць у мультыплікацыйнай форме беларускую азбуку выдатная. А ўжо пасля мы ўсвядомілі, якая ў гэтым хаваецца дыдактычная каштоўнасць і што такі матэрыял будзе запатрабаваны дзецьмі, — кажа **рэжысёр Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Ірына ТАРАСАВА.** — І сёлета для нас стала прыемнай нечаканасцю, што выйшаў новы буквар з нашымі фільмамі. Для маёй сям'і гэта ўвогуле вялікі падарунак, паколькі ў мяне сёлета і дачка пайшла ў першы клас, а мой муж працаваў над гэтым праектам ад пачатку і да завяршэння. Цудоўна, што стваральнікі новага буквара падумалі пра тое, як зрабіць яго сучасным. Цяпер у дзяцей будзе магчымасць з захапленнем засвойваць вучэбны матэрыял!

Яшчэ адной адметнасцю новага вучэбнага дапаможніка варта лічыць яго нацыянальны кантэнт. Стваральнікі адзначаюць, што буквар як асобная кніга нясе ў сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял. Ён дапамагае першакласнікам спасцігаць галоўныя агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці: сяброўства, любоў да Радзімы, да сваякоў, клопат пра старэйшых і дапамога малодшым. Вучыць працавітасці, самастойнасці, адказнасці за свае ўчынкі. Нацыянальнаму складніку ў змесце буквара аддадзена вялікая ўвага. На старонках вучэбнага выдання першакласнікі пазнаёмяцца з раслінамі, жывёламі, прадметамі і рэчамі, сімвалічнымі для беларусаў (валошкі, зубр, бусел, цымбалы, рушнікі і г. д.). Тэматыка тэкстаў для чытання таксама цесна звязаная з Беларуссю, што дае магчымасць засвойваць веды пра раслінны і жывёльны свет, рэкі, замкі і памятныя мясціны нашай краіны.

— На старонках буквара шырока выкарыстоўваецца беларускі арнамент. Па-першае, ім упрыгожана кожная новая літара. Па-другое, заніраванне вучэбнага матэрыялу зроблена пры дапамозе арнаменту, у якім прадстаўлены сімвалы маці, дзіцяці, сонца, жыцця — усяго таго, што з'яўляецца перадумовай гарманічнага развіцця першакласніка, яго імкнення да ведаў, — тлумачыць Вольга Свірыдзенка.

У новым буквары трэба было ўлічыць інтарэсы сучасных дзяцей, якія жывуць у інфармацыйнай прасторы і актыўна карыстаюцца электроннымі сродкамі яшчэ ў дашкольным узросце.

Варта адзначыць, што восенню ў дапаўненне да новага «Буквара» з'явіцца яшчэ і вучэбнае выданне «Спадарожнік буквара». У ім будзе прадстаўлена сістэма заданняў для дыферэнцыраванай работы з вучнямі, якія ўмеюць чытаць. Змест выдання ўключае творы, розныя па аб'ёме і ступені складанасці, што дазваляе арганізаваць работу з вучнямі з улікам узроўню навыку чытання (ад паскладовага чытання да чытання цэлымі словамі). У выданні «Спадарожнік буквара» таксама прадстаўлены электронны кантэнт краязнаўчага характару (відэаролікі пра Белавежскую пушчу, Нясвіжскі і Мірскі замкі, Мемарыяльны комплекс «Хатынь», Беларускі рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» і іншае).

Хоць афіцыйная прэзентацыя «Буквара» плануецца толькі 3 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але ўжо ў першы дзень новага навучальнага года ўсе першакласнікі атрымалі яго ў школе.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва аўтараў «Буквара».

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 15 сентября 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
1	Ножницы кривошипные НД3318Г (1212), станок заточной 3622Д (1239), выпрямитель сварочный ВД-306 У3 (1627), ножницы-пресс НА-633 (1630), фрезерный станок 676П (1662), вертикально-сверлильный станок 2С132К (1789), станок долбежный ГД320 (1842), пресс ручной винтовой ПР-1 (2073), станок токарный МК6056 (2339), полуавтомат сварочный СПАР ПДГ 250 (2567), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2583), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2584), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800/SP (2664), станок шлифовальный (2641), установка для аргонно-дуговой сварки УДГУ 351 AC/DC (2642), металлообрабатывающий ленточный станок G5018WA (2720), настольный сверлильный станок Е-1516В/230 (2767), точильно-шлифовальный станок 3Б634 (556), токарно-винторезный станок РТ 492 (1661), фрезерный станок 6К82Ш (2016), плоскошлифовальный станок 3Г71 (497), штабелер РА 1016 (3220)	39 463,20	3 946,32

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42. Контактный телефон +375 29 655 50 51.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2 в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.09.2021 г. в 17.00.**

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **Государственное предприятие «НПЦ по геологии»** (УНП 192018546) 247050, 220141, г. Минск, ул. Купревича, д. 7, ком. 206, тел.: 248-69-24; тел.\факс (017) 373-71-15

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **05 октября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Трансформатор ТМГ-12-400-У1 10/0,4, 2 шт.	8787,14
2	Трансформаторная подстанция 250 кВт и трансформаторная подстанция КПТТАС-63 кВа 10/0,4	4376,02
3	Кабель АБЛУ 3х120 – 375 метров, кабель АВБбШв 4х35 – 845 метров, кабель АСБл-10 3х35 – 995 метров	2226,55

Местонахождение – г. Слуцк, ул. Ленина, 293.

Для участия в торгах необходимо в срок с 03.09.2021 г. 09.00 по 04.10.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

«МНЕ ЗАЎСЁДЫ ШАНЦАВАЛА НА ПРАЦОЎНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ»

Начальнік АПС «Баранавічы-15» Святлана ПАЛЯКОВА — прадстаўнік дынастыі паштальёнаў. Усю сваю працоўную дзейнасць гэтай прафесіі прысвяціла яе маці — Марыя Дзмітрыеўна. Ды і малодшая сястра Наталля вырашыла пайсці па слядах маці і старэйшай сястры. Зараз яна працуе ў адным з сельскіх аддзяленняў сувязі Баранавіцкага раёна...

— Родам я з горада Баранавічы, дзе прайшло ўсё маё жыццё, — расказала Святлана Лявонцеўна. — Яшчэ дзяўчынкай часта прыбягала на пошту, дзе працавала мама, з інтарэсам назірала за тым, як працуюць маці і яе калегі. Марыла, што калі вырасту, абавязкова займуся гэтай адказнай і карыснай справай. Менавіта тады, у дзяцінстве, я цвёрда вырашыла звязаць сваё жыццё з поштай. І калі маці аб гэтым даведалася, то вельмі ўзрадавалася. Потым паштовым работнікам стала і мая родная сястра Наталля, яна маладзейшая за мяне на тры гады. І я, і сястра ў свой час скончылі Брэсцкае СПТВ № 51 сувязі — так тады называўся сучасны Брэсцкі дзяржаўны каледж сувязі.

Калі сястра паступіла ў СПТВ, я старалася дапамагчы ёй паспяхова асвоіць прафесійнае майстэрства. Ну, а мне, як вы здагадваецеся, усе неабходныя веды перадавала маці. У свой час яна дастаўляла людзям пісьмы, пенсіі, шматлікія газеты і часопісы. Гэта цяпер моладзь і людзі сярэдняга ўзросту актыўна карыстаюцца інтэрнэтам, а тады шмат чыталі перыядычных выданняў, і сумкі ў паштальёнаў былі даволі аб'ёмныя і цяжкія. Сёння, на жаль, выдавецкія тыражы значна меншыя. Але я вельмі ганаруся тым, што мы з сястрой працягваем матуліну справу, падтрымліваем нашу сямейную традыцыю.

Як адзначыла Святлана Лявонцеўна, за гады работы ёй давялося працаваць у розных аддзелах. Пачынала працоўную дзейнасць у шостым Баранавіцкім АПС у якасці аператара. Потым паслядоўна падымалася па прыступках службовай дзейнасці, напрацоўвала неабходны вопыт. У 2010 годзе Святлана Палякова ўзначаліла АПС «Баранавічы-15», дарэчы, адно з найбуйнейшых і найбольш складаных у горадзе, якое абслугоўвае даволі вялікі мікрараён, — 11 тысяч кватэр.

— Мне заўсёды шанцавала на працоўныя калектывы, — падкрэсліла Святлана Лявонцеўна. — Усюды мяне сустракалі цёпла, дапамагалі ў рабоце. З усімі калегамі я старалася падтрымліваць добрыя зносіны, і аб усіх калектывах, дзе я працавала, у мяне засталіся толькі добрыя ўспаміны.

Не памылюся, калі скажу, што літаральна з першага працоўнага дня я пераканалася, што абрала найлепшую работу з усіх магчымых, што не памылілася ў выбары. Вы не паверыце, але я так любіла сваю работу, што выхадныя дні былі для мяне існым пакараннем. Мне заўсёды хацелася хутчэй пайсці на работу. Усё для мяне было цікавым, хвалюючым, незвычайным. Але найбольшае задавальненне — гэта зносіны з самымі рознымі людзьмі ў працэсе работы. Дарэчы, усім маладым паштальёнам, якія прыходзяць да нас на работу, я настойліва раю з самага пачатку дзейнасці набываць вопыт зносін з людзьмі, умець знайсці падыход да кожнага грамадзяніна. Гэта, на мой погляд, адзін са складнікаў паспяховай работы на пошце.

Калі, напрыклад, у аддзяленне прыйшоў кліент, як той казаў, не ў добрым настроі, трэба зрабіць усё магчымае, каб згладзіць сітуацыю, і перавесці размову ў добрае рэчышча. Кожны супрацоўнік пошты павінен быць камунікатыўным, ветлівым, прыязным. І такімі якасцямі валодаюць усе работнікі аддзялення «Баранавічы-15». Большасць з іх працуюць на пошце многія гады. А яшчэ вельмі важна любіць і паважаць сваю працу. Бо далёка не ў кожнага чалавека хопіць сілы і энергіі кожны дзень пры любым надвор'і абыходзіць дзясяткі, а то і сотні жылых дамоў, дастаўляючы карэспандэнцыю альбо грошы пенсіянерам.

Па словах Святланы Лявонцеўны, калі аддзяленне, якое яна ўзначальвае, паспяхова выконвае ўсе планавыя паказчыкі, а водгукі кліентаў толькі станоўчыя, то сэрца напаўняецца радасцю за свой працоўны калектыў. Вельмі дружны і зладжаны, які неаднойчы прызнаваўся найлепшым у горадзе. Многія супрацоўнікі АПС «Баранавічы-15» не раз адзначаліся ганаровымі граматамі, падзякамі кіраўніцтва і грашовымі прэміямі. Шмат разоў узнагароджвалася і кіраўнік аддзялення. Але самая вялікая ўзнагарода для Святланы Паляковай — гэта падзяка кліента.

— Святлану Лявонцеўну я магу ахарактарызаваць як вельмі вопытнага, высокапрафесійнага работніка, які працуе ў нашай сістэме больш за 35 гадоў, — кажа **намеснік начальніка Баранавіцкага вузла сувязі Вольга БОРЫС.** — Яна валодае добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, і ўсё гэта дае ёй магчымасць паспяхова выконваць свае службовыя абавязкі. Дадам, што яна вельмі адказны, добрасумленны, ініцыятыўны чалавек, у якім можна быць упэўненым ва ўсіх без выключэння справах. Дзякуючы багатаму прафесійнаму вопыту, яна, не памылюся, з'яўляецца найлепшым настаўнікам для маладых паштальёнаў. Святлана Лявонцеўна шчодра дзеліцца вопытам з маладымі калегамі. І мы, кіраўніцтва раённага вузла сувязі, за гэта ёй вельмі ўдзячны. Цяжка нават пералічыць, колькі спецыялістаў паштовай сувязі яна падрыхтавала за мінулыя гады. У калектыве свайго паштовага аддзялення яна карыстаецца і павагай, і любоўю калег.

Фота аўтара.

Навіны РУП «Белпошта»

1 верасня 2021 года міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанцін Шульган наведаў вучэбна-педагагічны комплекс «дзіцячы сад — пачатковая школа» в. Броўкі, што знаходзіцца ў вёсцы Броўкі Мінскага раёна.

Канстанцін Канстанцінавіч сумесна з дырэктарам Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Жаннай Шабекай прынялі ўдзел ва ўрачыстай лінейцы, прысвечанай Дню ведаў і свята «Першы званок».

Кіраўнік ведамства павіншаваў педагогаў, вучняў і іх бацькоў з пачаткам вучэбнага года. Школьнікам пажадаў паспяховай вучобы, добрых адзнак, з цікавасцю вучыцца і з карысцю прымяняць новыя веды. А настаўнікам і бацькам пажадаў, каб яны выгадавалі і падрыхтавалі годных выхаванцаў, якімі потым будуць ганарыцца і якія праслявяць нашу краіну на самым высокім узроўні.

Усім навучэнцам былі ўручаны паштовыя карткі, якія хлопцы змогуць адправіць па пошце сваім родным і сябрам.

Пасля ўрачыстай лінейкі госці наведалі першы ў жыцці ўрок першакласнікаў і ўручылі ім памятныя падарункі. Адзін з іх — гэта кніга ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Мая Радзіма — Беларусь».

* * *

14 верасня 2021 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштоўку з арыгінальнай паштовай маркай «30-годдзе ўтварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў». Дызайнер паштоўкі — Святлана Цырулік. Спецыяльнае памятнае гашэнне пройдзе на паштамце Мінска 27 верасня.

* * *

13 верасня 2021 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «Службовыя сабакі беларускай мытні». Дызайн Яўгеніі Бядонік. У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

«СПОРТ МЯНЕ ЗАГАРТАВАЎ»

У якасці паштальёна Вольга ЛАЎРАНЮК працуе ўсяго сем месяцаў. Але за гэты адносна невялікі тэрмін яна заслужыла сапраўдны аўтарытэт і павагу сярод работнікаў аддзялення паштовай сувязі «Бальшавік» у аднайменным аграгарадку Мінскага раёна, бо не толькі паспяхова выконвае свае службовыя абавязкі, але і актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці калектыву. Прымае ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, рэгулярна выступае ў спартыўных спаборніцтвах. А яшчэ Вольга Мікалаеўна шматдзетная маці, выхоўвае траіх дзяцей.

Вольга ЛАЎРАНЮК падчас працы.

З дзяцінства спорт стаў галоўным захапленнем Вольгі. Асабліва прыцягвалі дзяўчынку лёгкая атлетыка і лыжныя гонкі. Імі яна актыўна займалася ў школьныя гады. Але, калі надышоў час паступаць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, перавагу Вольга аддала лёгкай атлетыцы. Па яе словах, спартыўная база ўніверсітэта дала цудоўную магчымасць актыўна трэніравацца, выступаць на розных спаборніцтвах. Атрымаўшы ў 2006 годзе дыплом выкладчыка фізічнай культуры, Вольга ўладкавалася па гэтай спецыяльнасці ў сяродняю школу ў родным Бальшавіку. І працавала там на працягу дзесяці гадоў.

— Спытаеце, як я апынулася на пошце? Нічога дзіўнага, — расказвае суразмоўніца. — Справа ў тым, што паштальёнам доўгі час працавала мая маці. А я, калі яшчэ вучылася ў школе, па меры магчымасці ёй дапамагала. Працавала і тады, калі знаходзілася ў дэкрэтным адпачынку. Потым я проста пайшла працаваць на яе месца. Дарэчы, калі ўжо заставалася нядоўга да пенсіі, бабулі дапамагаў і мой старэйшы сын Аляксандр. Зараз яму споўнілася 17 гадоў, хлопчык навучаецца ў паліграфічным каледжы. Сяродняму — Максіму — пяць, і ён марыць стаць аўтагоншчыкам. Але замест гоначнага баліда ён зараз ганяе па родным Бальшавіку на веласіпедзе. Малодшая дачка Вікторыя нарадзілася ў 2018 годзе, у яе, як вы разумееце, пакуль ніякіх захапленняў няма.

Чэсна скажу, на пошце працаваць значна лягчэй у параўнанні са школай. Там, бывала, даводзілася правадзіць па 6-8 урокаў у дзень, ды яшчэ і пазакласная работа. А гэта, паверце, даволі цяжка, нават для такога натрэніраванага чалавека, як я. Але з улікам таго, што спорт мяне сапраўды загартаваў, працаваць паштальёнам зусім не цяжка. Нават цікава, паколькі гэтая прафесія дае мне магчымасць зносін з вялікай колькасцю людзей.

Па словах Вольгі Мікалаеўны, амаль з усімі сваімі калегамі па паштовым аддзяленні яна была знаёма даўно. З імі раней працавала яе маці. У большасці сваёй гэта людзі немалодыя, з вялікім жыццёвым і прафесійным вопытам. Сустрэлі яе ў калектыве вельмі цёпла, адносіны паміж людзьмі ў АПС «Бальшавік» вельмі добрыя. Калектыў — як адна сям'я. З улікам таго, што Вольга Лаўранюк працавала тут у час дэкрэтнага адпачынку, як той казаў, на добраахвотных пачатках, ніякіх прафесійных сакрэтаў на пошце для яе не было.

Пераможца спартыўных спаборніцтваў.

— Работа на пошце мяне вельмі радуе, — адзначыла Вольга Мікалаеўна. — Я заўсёды ў руху. Кожны дзень, пры любым надвор'і абыходжу свой участак. Там і прыватны сектар, і шматкватэрныя дамы. З многімі жыхарамі пазнаёмілася, наладзіла добрыя зносіны. Людзі сустракаюць ветліва, ставяцца з павагай. Тым больш што многія мяне ведаюць яшчэ з таго часу, калі я працавала ў школе.

На мой погляд, галоўнае ў жыцці — гэта сямейны дабрабыт. Па сябе ведаю, як цяжка выхоўваць траіх дзяцей. А ёсць нямала сямей, у якіх дзетак яшчэ больш. І жанчынам, як захавальніцам сямейнага ачага, там значна цяжэй. І трэба заўжды такіх жанчын паважаць. Ёсць у мяне і асабістае жаданне. Калі скончыцца пандэмія, у час адпачынку ўзяць дзяцей і паехаць з імі на мора. Даўно там не была...

Фота з архіва Мінскага абласнога філіяла РУП «Белпошта».

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
3 верасня 2021 г. № 34 (619)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКЦЭНТЫ

«МЫ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЬ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ ПАТРЫЁТАМІ»

1 верасня для сенатараў выдалася вельмі насычанае: яны ўдзельнічалі ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных Дню ведаў

Фота Белта.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА адкрывала пасля рэканструкцыі сталічную гімназію № 25, што ў Заводскім раёне. Школа была адкрытая яшчэ ў 1957 годзе, таму зразумела, што маральна і фізічна ўстарэла. У 2017-м гарадскімі ўладамі было прынята рашэнне аб яе рэканструкцыі. За гэты час стары неатынкаваны будынак з белай цэглы ператварыўся ў новабудоўлю. Сёння гімназія складаецца з двух асобных карпусоў, злучаных галерэямі. Другі, дарэчы, пабудавалі з нуля, і цяпер агульная плошча ўстановы адукацыі складае 17,5 тысячы метраў.

Больш падрабязна аб наведванні спікерам Савета Рэспублікі сталічнай гімназіі мы пісалі ўчора (у № 168 ад 2 верасня).

Не абмінулі ўвагай сенатары і іншыя куткі краіны, дзе 1 верасня прагучалі першыя званкі для першакласнікаў і іншых навучэнцаў.

Так, **намеснік старшыні Анатоль ІСАЧАНКА** ў Дзень ведаў наведаў магілёўскую гімназію № 3. На ўрачыстай лінейцы ён пажадаў вучням, іх бацькам і настаўнікам узаемных павагі і разумення:

— Першае верасня — асаблівы дзень для першакласнікаў і іх бацькоў. Яны рыхтаваліся да гэтага дня, а цяпер хвалююцца: за якую парту пасадзяць, які будзе настаўнік. А ў тых, хто ідзе ў 11-ы клас, — іншыя чаканні. Хтосьці ўжо вызначыўся, куды будзе паступаць. Гэта час, калі маладыя людзі на парозе дарослага жыцця. І я хацеў бы пажадаць бацькам і настаўнікам, каб вы клапаціліся не толькі пра тое, каб даць дзіцяці веды, але і выхаванне. Мы павінны выхоўваць нашых дзяцей патрыётамі. А гэта значыць — любіць свой дом, сваю вуліцу, свой горад і сваю Радзіму.

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента ўручыў гімназіі сертыфікат, а кожны з першаклашак атрымаў у падарунак ад Прэзідэнта кнігу «Беларусь — наша Радзіма».

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у гэты святочны дзень брала ўдзел ва ўрачыстай лінейцы ў ліцэі МУС.

У сваім прывітальным слове парламентарый пажадала педагогам прафесійных поспехаў, мудрасці і цярпення, вучням — настойлівасці, выдатных адзнак і творчасці ў надыходзячым навучальным годзе.

— Перакананая, што вам па сілах пераадолець усе цяжкасці, стаць па-сапраўднаму адукаванымі людзьмі і ўнесці свой уклад у развіццё роднай Беларусі, — падкрэсліла яна ў завяршэнне.

Не абышлося і без сюрпрызаў — сенатар падарыла ліцэістам ровары айчыннай вытворчасці.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ павіншаваў са святам гімназістаў Кобрына і сустрэўся з педагагічным калектывам.

Сенатар павіншаваў педагогаў, навучэнцаў гімназіі і бацькоў з пачаткам новага навучальнага года, першакласнікам уручыў кнігі — падарунак кіраўніка дзяржавы «Беларусь — наша Радзіма».

Падчас сустрэчы сенатара з педагогамі абмяркоўваліся актуальныя пытанні развіцця сістэмы адукацыі. Парламентарый адказаў на пытанні, якія датычыліся грамадзянска-патрыятычнага, працоўнага выхавання дзяцей і моладзі, а таксама расказаў аб заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі.

Разам з парламентарыем удзел у святочных мерапрыемствах бралі намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Барысюк і намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама Іван Карабко.

А вось **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** разам з **членам Савета Рэспублікі, старшынёй Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталляй ЯКУБІЦКАЙ** завіталі ў сярэднюю школу № 1 ім. В. Ф. Купрэвіча, што ў Смалявічах.

Сенатары таксама прысутнічалі на цырымоніі адкрыцця школьнага стадыёна, які цалкам змяніўся пасля рамонту: абсталяваны футбольнае поле з мяккім пакрыццём, пляцоўка для валейбола, бегавыя дарожкі і ўсталяваны трэнажоры для занятку фізкультурай. Яшчэ адна навінка — уласная скейт-пляцоўка. Наведваць стадыён цяпер могуць як школьнікі, так і жыхары мікрараёна.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

АКТУАЛЬНА

Масачны рэжым ніхто не адмяняў

Старшыня Савета Рэспублікі, супаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА правяла селектарную нараду з прадстаўнікамі сістэмы аховы здароўя па пытаннях процідзеяння распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі.



Адзначым, што гэтыя пытанні знаходзяцца на асабістым кантролі Старшыні Савета Рэспублікі. Такія нарады сталі традыцыйнымі і праводзяцца штотыднёва.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, падчас канструктыўнай і дэталёвай размовы спікер Савета Рэспублікі абмеркавала з прадстаўнікамі Міністэрства аховы здароўя, установ аховы здароўя абласцей і сталіцы бягучую сітуацыю з захваральнасцю на COVID-19, функцыянаванне медыцынскіх устаноў краіны, меры эпідэмічнага рэагавання і выбудоўванне работы, у тым ліку з насельніцтвам.

Наталля Качанава паставіла задачу падрыхтаваць больш шырокі аналіз па катэгорыях прышчэпленых грамадзян і па захваральнасці на COVID-19 у дадзеных катэгорый. Таксама Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што масачны рэжым ніхто не адмяняў. А значыць, неабходна правяраць: як людзі носяць маскі ў крамах, транспарце, грамадскіх установах і гэтак далей.

— Кіраўніцтву сталіцы і іншых абласцей неабходна трымаць на пастаянным кантролі пытанні эпідэміялагічнага дабрабыту, — падкрэсліла яна.

Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя канстатавалі, што сёння ўсе службы функцыянуюць у штатным рэжыме, праблемных пытанняў няма.

Размова па сутнасці

Рэгіянальны форум «Беларусь адзіная» прайшоў у Наваполацку

У ім узяў удзел намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ. Форум сабраў больш за 500 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый і палітычных партый.

Цэнтральнымі тэмамі гутаркі, прысвечанай Году народнага адзінства, сталі развіццё інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі, маладзёжная палітыка, удзел бізнес-супольнасцяў у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, трансфармацыя палітычнай сістэмы Беларусі, неабходнасць і магчымыя шляхі пашырэння ўплыву палітычных партый на грамадска-палітычнае жыццё.

У якасці экспертаў выступалі дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вадзім Гігін, аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксандр Аўдонін, дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» Аляксандр Шпакоўскі, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, палітолаг Аляксей Дзермант і іншыя.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

Малому бізнесу патрэбна падтрымка

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у рамках «адкрытай прыёмнай», якую правялі на базе адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска, узяла ўдзел у абмеркаванні актуальных праблем і пытанняў, ініцыіраваных суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

У прыватнасці, дэталёва і ўважліва разгледзелі пытанні, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні дзяржаўных закупак і закупак за кошт уласных сродкаў, у тым ліку ў рамках пастановы Саўміна «Аб удасканаленні адносін у галіне закупак тавараў (работ, паслуг) за кошт уласных сродкаў». Таксама ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў былі асаблівасці ажыццяўлення закупак у будаўніцтве ў сувязі са змяненнем заканадаўства; маркіроўка тавараў уніфікаванымі кантрольнымі знакамі і сродкамі ідэнтыфікацыі; адміністрацыйная адказнасць за нявыплату абавязковых страхавых узносаў.

Акрамя таго, абгаварылі пытанне аб дзяржаўнай падтрымцы новых бізнес-ініцыятыў і аказанні фінансавай дапамогі бізнесу-пачаткоўцу.

У абмеркаванні важных і актуальных для малога і сярэдняга прадпрымальніцтва тэм удзельнічалі таксама прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Цэнтральным раёне г. Мінска, Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Работнікі гэтых дзяржаўных органаў і арганізацый узялі на кантроль агучаныя прадпрымальнікамі пытанні. Адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска рэкамендавана зрабіць такія сустрэчы часткай штодзённай работы, разглядаючы на іх найбольш актуальныя праблемныя пытанні.

НА КАНТРОЛІ

Зрабілі ўлады, зрабі і сам

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у рамках кантролю за разглядам калектыўнага звароту жыхароў дома № 80 па вуліцы Нёманскай у Мінску праверыла, як выконваюцца работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, прылеглай да гэтага дома. І зрабіла тое з выездам на месца.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, паводле інфармацыі Мінскага гарвыканкама, 26 жніўня работы па ўладкаванні пад'язных шляхоў і комплексным добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі дадзенага жылога дома былі завершаны: тут з'явіліся сучасная дзіцячая пляцоўка і велапаркоўка.

Сенатар адзначыла, што тэрыторыя сапраўды змянілася. Пры гэтым Таццяна Рунец падкрэсліла, што мясцовыя жыхары таксама павінны ўносіць уклад у добраўпарадкаванне свайго двара.

Бягучай восенню разам з жыхарамі дома будуць пасаджаны дрэвы і кусты на дваровай і прылеглай да яе тэрыторыі.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

«ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПРАЦА — ВЫРОШЧВАЦЬ І ЗБІРАЦЬ УРАДЖАЙ»

На мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ працавала ў рэгіёне: у цэнтры ўвагі сенатара была Століншчына. Тут старшыня профільнай камісіі ўзяла ўдзел у пасяджэнні мясцовага райвыканкама, сустрэлася з працоўным калектывам філіяла «Савушкін прадукт», пазнаёмілася з дзейнасцю Гарынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, наведала шматдзетную сям'ю ў Альшанах і аднайменную фермерскую гаспадарку.

Што хвалюе?

Здаецца, пытанне з катэгорыі рытарычных. Камфорт і дастатак заўсёды былі і застаюцца аднымі з галоўных інтарэсаў людзей, незалежна ад месца іх пражывання: ці то сталіца, ці то Століншчына... Таму ў цэнтры ўвагі мясцовай «вертыкалі» ўлады было пытанне вынікаў работы мясцовага ЖКГ і павышэння якасці жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву. Як высветлілася, нездарма.

Па выніках разгляду згаданага пытання на пасяджэнні райвыканкама, у якім бралі ўдзел кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый раёна, а таксама старшыні мясцовых Саветаў дэпутатаў, былі агучаны недахопы, што яшчэ існуюць у дзейнасці мясцовай камунальнай арганізацыі. У кіраўніцтва раёна

застаюцца на кантролі пытанні ўводу ў эксплуатацыю кацельні № 37 у г. Давыд-Гарадок, станцыі абязжалезвання ў аграгарадку Рамель, зніжэння страт у цеплавых і водаправодных сетках і іншыя праблемныя тэмы.

Выступаючы перад удзельнікамі мерапрыемства, парламентарый адзначыла, што развіццё сістэмы ЖКГ у першую чаргу павінна быць накіравана на павышэнне якасці і даступнасці ўсіх відаў жыллёва-камунальных паслуг, удасканаленне сістэмы тарыфнай палітыкі, паляпшэнне добраўпарадкавання населеных пунктаў, павышэнне эфектыўнасці кіравання і прафесійнага ўзроўню кадравага саставу.

Па выніках абмеркавання цэнтральнага пытання парадку дня сенатар унесла свае прапановы ў праект рашэння выканкама.

Жыццё і работа ў рэгіёне

Падчас сустрэчы з працоўным калектывам філіяла ААТ «Савушкін прадукт» парламентарый азнаёмілася з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго філіяла ў Століне і пагутарыла з работнікамі.

Трэба сказаць, што некалі вядомы Столінскі сыраробчы камбінат з пераходам у найбуйнейшы малочны холдынг усходняй Еўропы яшчэ больш узмацніў свае пазіцыі: за 10 гадоў інвестыцыі ў развіццё вытворчасці склалі больш за 20 мільёнаў долараў. Безумоўна, гэта прынесла свой вынік — асартымент працягвае павялічвацца, якасць прадукцыі — забяспечваць запыты пакупнікоў, а дабрабыт работнікаў — паляпшацца год ад году. На прадпрыемстве цяпер працуюць 312 чалавек, сярэдні заробак перавышае 1,5 тысячы рублёў — для райцэнтра вельмі дастойныя грошы.

На сустрэчы з калектывам прадпрыемства Таццяна Рунец расказала аб структуры і задачах беларускага парламента, рабоце над законапраектамі, якія паступілі на разгляд у Пастаянную камісію Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Асаблівую ўвагу сенатар аддала дзейнасці ў якасці члена Канстытуцыйнай камісіі і прапанаваным навацыям.

Сустрэча была дастаткова насычаная, паколькі, акрамя інфармацыйнай часткі з боку парламентарыя, стала карысная для прысутных яшчэ і з пункту гледжання адказаў на агучаныя пытанні: людзей цікавіла развіццё роднага горада, а таксама пашырэнне інфраструктуры. Пасля заканчэння сустрэчы з калектывам Таццяна Рунец правяла асабісты прыём грамадзян.

Адзначым, што знаёмства з вытворчым патэнцыялам рэгіёна пачалося днём раней — з наведвання Гарынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, аднаго з найбуйнейшых вытворцаў керамічнай цэглы і каменя, якія выкарыстоўваюцца як для ўкладкі, так і аблiцоўвання фасадаў будынкаў. Прадукцыя гэтага прадпрыемства запатрабаваная на рынках Расіі і Украіны. Шмат жылых дамоў на Століншчыне пабудавана з чырвонай цэглы, якая вырабляецца тут.

Шматдзетным — асаблівая ўвага

Асобна ў рамках наведвання сенатарам Століншчыны трэба вылучыць паездку ў аграгарадок Альшаны. І вось чаму.

Тут жыве шматдзетная сям'я Міхаіла і Ганны Грыб. Сужэнцы выхоўваюць сем дзяўчынак, жывуць з зямлі і, як той казаў, радуюцца жыццю. Напярэдадні Дня ведаў Таццяна Рунец не магла не завітаць у гэтую сям'ю.

— Сям'я вельмі дружная і гасцінная, вызначаецца працавітасцю, бацька іх шмат майструе сваімі рукамі, — падзялілася ўражаннямі ад свайго візіту сенатар. — Самі ж гаспадары не лічаць сваю сям'ю асаблівай — у Альшанах нямала шматдзетных.

Парламентарый падзякавала гаспадарам за цёплы прыём, пажадала моцнага здароўя і ўручыла бацькам і дзецям падарункі. Павіншаваць вялікую сям'ю з пачаткам навучальнага года прыехалі таксама старшыня Столінскага райвыканкама, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Рыгор Пратасавіцкі, старшыня Альшанскага сельскага Савета дэпутатаў Віктар Гапко.

Фінальным акордам наведвання аграгарадка стала знаёмства з фермерскай гаспадаркай «Альшаны» Івана Грыба. Як прызналася сенатар, Століншчына яе ўразіла і тут. Фермерская гаспадарка на сённяшні дзень — гэта 253 гектары, якія апрацоўваюць больш за сто чалавек. 16 гектараў адведзена пад зімнія цяпліцы, дзе вырошчваюцца таматы.

— Работа не з лёгкіх. Гэта вялікая праца — вырошчваць і збіраць ураджай, — падсумавала вынікі свайго візіту старшыня профільнай камісіі.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА,
фота sovrep.gov.by

Час дзейнічаць!

З крэатывам — да выйгрышу

«ПІН_КОД» тэлеканала «Беларусь 2» сумесна са школай блогераў Media kids для юных творцаў у сацыяльных сетках аб'яўляе спаборніцтва для гледачоў праекта, пераможца якога атрымае новы смартфон!

Каб узяць удзел у розыгрышы, канкурсанту трэба зняць влог пра сваю школу. Прычым фармат і тэму відэа кожны можа выбіраць самастойна. Будзе гэта рэпартаж з урока, расповед пра цікавыя факты, звязаныя са школай, ці нават пародыя на любімых настаўнікаў — вырашаеце толькі вы. Каманда тэлепраекта дае поўную свабоду выбару, таму ўключайце фантазію і дзейнічайце. Адзіны нюанс: працягласць відэа павінна быць да 1 хвіліны. Вынікі розыгрышу будуць падведзены ў першы дзень асенніх канікулаў — 31 кастрычніка, а значыць, ёсць час для творчых пошукаў і эксперыментаў над іх увасабленнем.

Таксама каманда праекта запускае чэлендж «Запрасі ПІН_КОД у госці». Тэлегледачы цяпер могуць запрасіць здымачную групу любімай праграмы ў свой родны горад альбо вёску. Усё, што для гэтага патрэбна, — расказаць пра сябе і свой населены пункт на афіцыйнай старонцы «ПІН_КОДА» ў «Інстаграме» (@pin_kod_official). І, вядома, да аўтараў самых цікавых гісторый «Беларусь 2» прыедзе ў госці. А каб зрабіць вандроўку па краіне разнастайнай, «пінкодаўцы» прыдумалі цікавінку — кожны ўдзельнік чэленджу будзе перадаваць памятны падарунак для наступнага, тым самым гледачы з розных куткоў краіны змогуць парадаваць адзін аднаго прыемнымі сюрпрызамі.

Далучайцеся, і няхай фантазія і фартуна будуць на вашым баку!

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 147

На маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64, які адбыўся ў Балгарыі (Кранева) з 20 да 31 жніўня, у першыя дні спаборніцтваў прайшлі хуткая і маланкавая праграмы. Чэмпіёнамі свету па хуткай гульні сталі Георгій Выдзерка, Аляксей Паўлючэнка, Яна Якубовіч, Дар'я Нікіфарава і Яўгенія Швед! У маланкавай перамаглі Г. Выдзерка, Я. Якубовіч, А. Сіняк і Я. Швед. Яшчэ 19 сярэбраных і бронзавых медалёў у розных узростах заваявалі нашы шашысты ў гэтых праграмах.

Па шашках-64 кампазіцыі складзены вядучым аддзела.

№ 98



№ 98

Белыя простыя шашкі: c1, d2, f2, h2, a3, e3, d4, c5 (8)

Чорныя простыя шашкі: b2, h4, a5, g5, f6, a7, e7, g7 (8)

№ 99

Белыя простыя шашкі: e1, g1, b2, d2, f2 (5)

Чорныя простыя шашкі: h2, a3, d4, c5, g5, d6, c7 (7)

№ 100

Белыя простыя шашкі: h2, d4, f4, h4, e5 (5)

Чорныя простыя шашкі: f2, b4, c5, b6, c7, e7, g7 (7)

Наступныя кампазіцыі ў шашкі-100 складзены Валерыем Кручковым (Украіна).

№ 101

Белыя простыя шашкі: 49, 38, 18, 19, 20, 13, 14, 9 (8)

Чорныя простыя шашкі: 37, 39, 40, 32, 27, 3, 4 (7)

№ 102

Белыя простыя шашкі: 41, 33, 30, 22, 23, 17, 18, 19, 13 (9)

Чорныя простыя шашкі: 44, 37, 39, 32, 35, 28, 24, 10 (8)

№ 103

Белыя простыя шашкі: 41, 31, 32, 34, 28, 17, 19, 11 (8)

Чорныя простыя шашкі: 43, 35, 26, 18, 12, 6, 8, 10 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Выпуск № 146 ад 20.08.21.

№ 92 1. e3-d4 g3:e5 2. d4-c5 h6:f4 [2...f6:h4 3. c3-b4 a5:c3 4. b2:a5 h8-g7] 3. c5-d6 e7:c5 4.c3-b4 a5:c3 5. b2:e3 +

№ 93 Белыя c1,e1, f2, e3, f4; чорныя a5, g5, d6, h6, d8, P: g3 (e7A)h4 (f6) e5 (d2) e3 (b4) d2 (a3) c3x

A (h4) d4.g3 (e7B) de5 (c5) d6 (f6) b4. h4x B (c5) b6.h4 (e7) hg5 (b6) b2 (c5) c3 (d6) f6x +.

№ 94 1. e3-d4 c5:c1 2. a7:e7 f8:d6 3. c3-d4 e5:c3 4. g5-h6 c1:g5 5. h6:h6 h2:f4 6. h6:c1 a3-b2 7. c1:a3 +

№ 91 1. d6-e7 f8:d2 2. h6:f8 e3:c5 3. f8:e1 f6-g5 4. g1:e3 g3-h2 5. e1-g3 h2:d2 6. c1:e3 g5-h4 7. e3-f4 h4-g3 8. f4:h2 +

№ 95 1. c5-b6 a5:e5 2. f6:f2 h8:f6 3. f2-g3 c3:a5 4. h4-g5 f6:f2 5. g1:a3 +

№ 96 1. c7-d8 [1. c7-b8 a5:e5 2. h6-g7 f4:f8 3. b8:e7 f8:d6 4. g1:e3 d6-e5]

1. ..a5:e5 2. d8-f6 e5:g7 3. h6:f8 f4:h6 4. f8:g5 h6:f4 5. g1:g5 +

№ 97 1. b4-c5 b6:b2 2. f2-e3 e1:f2 3. g1:a3 +

Выпуск № 144 2021-07-23 № 85 ПР: 25,17,38,41,1+ знайшоў Г. Андрэеў

Першыя дакладныя адказы даслалі В. Бандарык (Мінскі р-н), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Рашэцін (Ашмяны).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

Адзначаем свята пісьменства на «Беларусь 3»

Да Дня беларускага пісьменства сацыякультурны тэлеканал падрыхтаваў тэматычны эфір. Тут пакажуць кінастужкі і спектаклі паводле твораў айчынных пісьменнікаў і прадставяць новы адукацыйна-пазнавальны праект «Кафедра», а 4 і 5 верасня разам са здымачнай групай «Беларусь 3» гледачы змогуць наведаць горад Капыль і ўбачыць прамыя трансляцыі з месца правядзення кніжнага свята.

Штогод з 1994-га свята пісьменства, якое традыцыйна адзначаецца ў першую нядзелю верасня, вандруе па гістарычных цэнтрах беларускай культуры, навукі і літаратуры. Так, яно ўжо пакінула свой след у гісторыі многіх беларускіх гарадоў, сярод якіх Полацк, Бялынічы, Хойнікі, Шклоў, Тураў, Нясвіж і іншыя. Сёлета эстафету ўрачыстых цырымоній і тэматычных мерапрыемстваў прымае горад Капыль Мінскай вобласці. Здымачная група тэлеканала «Беларусь 3» наведае ўсе святочныя пляцоўкі, пазнаёміцца з гасцямі і выступоўцамі і пакажа ў выпусках праграмы «Навіны культуры», як ушаноўваецца гісторыка-культурная і духоўная спадчына Капыльшчыны. Дарэчы, з верасня праект будзе выходзіць у новым графічным афармленні.

Акрамя таго, эфір сацыякультурнага тэлеканала з 3 да 5 верасня дапоўніцца гульнявымі кінастужкамі і мультфільмамі вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» і тэатральнымі пастаноўкамі, створанымі паводле мастацкіх тэкстаў беларускіх літаратараў — Алеся Адамовіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Мележа, Андрэя Макаёнка, Кандрата Крапівы, Францішка Аляхновіча, Івана Шамякіна, Аляксея Дударава, Янкі Маўра і Янкі Купалы. Так, убачым спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Адамавы жарты», «Паўлінку» ад Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, драматычную баладу «Не пакідай мяне...» ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Змогуць перагледзець кінааматары і некаторыя фільмы вытворчасці «Беларусьфільма», у аснове якіх творы айчыннай класікі, а менавіта «Дзікае паляванне караля Стаха» (1979), сатырычная камедыя «Хто смяецца апошнім» (1954), «Вазьму твой боль» (1980), «Людзі на балоце» (1981), «Белыя росы» (1983), «Лыжка для салдата» (2015). У тэматычных праграмах прагучаць гісторыі жыццёвага і творчага лёсу класікаў і сучасных майстроў слова. У прыватнасці, згадаем Кандрата Крапіву ў выпуску праграмы «Люблю і памятаю», Івана Мележа і яго перарваныя хронікі ў праекце «Запіскі на палях», а таксама трапім на сустрэчу Навума Гальпяровіча з беларускім пісьменнікам Віктарам Шніпам, які стане госцем «Суразмоўцаў».

5 верасня а 12 гадзіне на «Беларусь 3» адбудзецца прамая трансляцыя ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства, увечары ў 19.30 канал пакажа канцэртную праграму закрыцця культурнага форуму. А яшчэ ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала днём гледачоў чакае прэм'ера цыкла адукацыйна-пазнавальных лекцый «Кафедра».

— Мы бачым, што фармат адукацыйных лекцый шмат гадоў застаецца вельмі запатрабаваным у культурным асяроддзі, збірае мноства зацікаўленых слухачоў як у арт-прасторах, так і анлайн, — распавядае **галоўны дырэктар сацыякультурнага тэлеканала Наталля МАРЫНАВА.** — Цягам часу гэты фармат таксама выдатна зарэкамендаваў сябе ў эфіры «Беларусь 3» і дапоўніў шэраг нашых фірменных пазнавальных праграм пра знакамітых творцаў, беларускае выяўленчае мастацтва, музыку, кіно, архітэктуру і нематэрыяльную гісторыка-культурную спадчыну. Новы праект «Кафедра» — гэта цыкл паўнавартасных тэлевізійных лекцый ад вядомых беларускіх экспертаў, даследчыкаў і мастацтвазнаўцаў, першыя выпускі якога мы прысвячаем гістарычным этапам кнігадрукарства на беларускіх землях і адмыслова прымяркоўваем да Дня беларускага пісьменства.

У святочны дзень на «Беларусь 3» у 17.35 адбудзецца паказ адразу дзвюх лекцый з цыкла «Кафедра»: «Чаму кнігі прамавугольныя і прычым тут козы» і «Брэст, Авідзій і друкарскія станкі: як набывалі кнігу ў XVI стагоддзі». Далей праект будзе выходзіць у эфір па нядзелях.

Алена ДРАПКО.

Фота з адкрытых крыніц.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Жаночыя сакрэты» (16+).
13.05, 15.25 Меладрама «Таксічнае каханне» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка (прамы эфір).
18.15, 0.55 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.35 Арэна.
1.15 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
9.00, 19.35 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.30 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.10 «На тыдзень» (16+).
12.10 Прыгода «За гранню рэальнасці» (12+).
14.15 Анімацыйны фільм «Рататуй» (6+).
16.10 Серыял «Стыч!» (6+)
17.00 «Суперлато».
17.40 «Арол і рэшка. Перазагрузка-3» (16+).
18.30 «Сакрэтны мільянер» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.20 Хачу ў тэлевізар!

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Мяса кісла-салодкае.
8.05, 12.00, 19.40, 23.20 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.15 «Вазьму твой боль». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].
10.40 «Рагаты бастыён». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].
12.20 «Беларуская кухня». Запечаны бурак.
12.45 «Наперад у мінулае».
13.10, 21.05 «Вялікае кіно. «Месца сустрэчы змяніць нельга». Дакументальны фільм (12+) [СЦ].
13.40, 21.30 «Месца сустрэчы змяніць нельга». Серыял (12+) [СЦ].
14.50 «Навукаманія» (6+).
15.15 «Хто смяецца апошнім». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].
16.55 «Запіскі на палях». Алесь Адамовіч: голас знямелых [СЦ].
17.20 «Ідзі і глядзі». Мастацкі фільм (16+).
20.00 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 «Люблю і памятаю».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2022. Беларусь — Уэльс.
8.55 Вынікі тыдня.
9.40 Хакей. КХЛ. «Поўнач-сталь» (Чарапавец) — «Дынама-Мінск».
11.40 Гандбол. SEHA-ліга.
13.30 Вялікі спорт.
14.15 Плаванне. Ліга ISL.
16.25, 23.30 Спорт-цэнтр.
16.35, 19.55, 21.55 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
18.35 На грані фолу. Футбольны агляд.
23.40 Аўтаспорт. Экстрым-Е.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.25** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.35 Серыял «Самы лепшы муж» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Прапаганда» (16+).
21.35 Серыял «Ікра» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.35 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.30, 20.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Лягавы». Серыял (16+).
18.30 «Па сутнасці».
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
22.00 «Скардзіцца дазваляецца».
1.00 «Самая карысная праграма» (16+).
1.55 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Серыял «Вольная грамата» [СЦ] (16+).
5.15 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
7.00, 10.10, Серыял «Вялікі перапынак».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 2.55 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 18.00, 3.40, 4.25 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00, 22.00 «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
23.25 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
1.20 Маст. фільм «Вясёлыя рабяты».

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.20 «Таямніцы Беларусі» (16+).
12.30 «Спецыяльны рэпартаж».
12.50 «У людзях».
13.35 «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.45 Серыял «Таямніцы следства» (16+).
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Прыватнае жыццё» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 «Здароўе» (12+).
7.00, 8.25, 10.25 Драма «Трымайся за аблокі» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
12.05 Гісторыі выратавання (12+).
12.30, 13.50, 16.30 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
16.20, 19.40, 22.10, 23.40 Сёння. Галоўнае.
17.55 «ДНК» (16+).
19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
22.15 «НЗ.by».
22.35, 23.55 Маст. фільм «Суддзя» (16+).

8 канал

7.00, 14.40, 17.30, 21.05, 1.20 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад «Трансформеры прайм» (6+).
7.30, 14.45 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Жыццё Харлі» (12+).
8.15 Серыял «Светлячок» (12+).
9.40, 15.15 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).
10.25 Серыял «Інданезія».
11.10 Баявік «Тэрмінатар-3. Паўстанне машын» (16+).
13.00 Серыял «Пэры Мэйсан» (12+).
13.50 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
14.50 Мультпарад «Монстры за працай» (0+).
15.10 «Хачу ў Парыж».
16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).
17.35 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.35 Серыял «Самара» (16+).
20.05 Серыял «Бандыцкі Пецярбург» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 Драма «Бой з ценем» (16+).

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» Дайджэст (16+).
9.00, 0.10 «Проста кухня» (16+).
10.00 «Каледж» (16+).
11.20 Серыял «Ералаш» (6+).
12.00 «Галерэя прыгажосці» (16+).
12.30 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.05 Анімацыйны фільм «Рэтчэт і Кланк: галактычныя рэйнджары» (6+).
14.55, 17.30, 19.00 Серыял «Зусім летнія» (16+).
21.00 «Форт Баярд» (16+).
22.35 «Наш рамонт» (16+).
23.15 «Рогаў у справе» (16+).
1.05 «Тата ў дэкрэце» (16+).
1.25 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
3.00 «Даеш моладзь» (16+).
4.40 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Воўк і цяля». «Доктар Айбаліт». М/ф.
8.00 Вялікія і маленькія.
9.45 «Мы — грамацеі!»
10.30 «Справа «Пярэстых». Маст. фільм [СЦ].
12.10 Лісты з правінцыі. Рэспубліка Башкартастан [СЦ].
12.40, 1.35 Дыялогі пра жывёл. Новасібірскі заапарк [СЦ].
13.25 «Калекцыя». Дак. серыял [СЦ].
13.55 Абсалютны слых. Альманах па гісторыі музычнай культуры.
14.35 100 гадоў з дня нараджэння Станіслава Лема. «Гульня ў бісер».
15.20 «Жыў-быў наладчык...» Маст. фільм [СЦ].
16.30 «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
17.10 «Пешшу. Іншая справа». Мендзялееў [СЦ].
17.40 «Дзмітрый Данскі. Выратаваць свет». Дак. фільм [СЦ].
З году ў год Алесь Зайка выпраўляўся ў вандроўкі па дарагіх яму мясцінах у пошуках самабытнага слова, народнай песні, прыказкі ці прымаўкі. За дзесяцігоддзі сабралася мноства сшыткаў, папак, картак з запісамі. Архіў папаўняўся, матэрыялы паступова станавіліся асновай для кніг. Але пра ўсё па парадку.

Алесь Фаміч Зайка нарадзіўся ў Заполлі Івацэвіцкага раёна ў 1948 годзе. Пасля школы скончыў філалагічны

Сваім жыццём ён, несумненна, паслужыў многім людзям. На кнігу «Дым з коміна» ў раённай бібліятэцы некалькі гадоў была чарга.

факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута. Адслужыўшы ў войску, вярнуўся ў родную вёску, дзе настаўнічаў да пенсіі. З выхадам на заслужаны адпачынак увесь свой час прысвяціў любімай справе. Прыводзіў у сістэму сабраны матэрыял, дапрацоўваў, рыхтаваў да выдання кнігі.

Успамінаю, як прыехала да Алеся Фаміча ранняй вясной, яшчэ ляжаў снег. Ён сустрэў каля весніц і запрасіў у рабочы кабінет. Тады мяне найбольш уразіў вялізны пісьмовы стол. На ім у вядомым толькі гаспадару парадку ляжала мноства канвертаў з карткамі, сшыткі, а таксама навуковыя працы, слоўнікі, даведнікі. Кожны адкрыты на пэўнай старонцы — гэта азначала, што ўсё знаходзіцца ў рабоце. Алесь Фаміч гаварыў, што вычытвае рабочы экзэмпляр кнігі «Паселішчы Івацэвіччыны». Неўзабаве кніга ўбачыла свет. У ёй сабраны звесткі пра ўсе населеныя пункты раёна. На падставе архіўных і іншых крыніц адлюстравана гісторыя кожнай вёскі, тлумачыцца яе назва, даецца шмат цікавай і пазнавальнай інфармацыі.

ВАЛУНЫ З ДОШКАМІ

Гэта яго клопатам у 25 найбуйнейшых населеных пунктах з'явіліся мемарыяльныя дошкі са звесткамі аб першай згадцы вёскі альбо мястэчка. Дошкі, як правіла, прымацаваныя на валунах, сталі своеасаблівымі помнікамі. Бо цяпер, калі, напрыклад, праводзіцца свята вёскі, тыя валуны абавязкова становяцца цэнтрамі святкавання. Маладыя пары пры заключэнні шлюбу абавязкова робяць сэлфі на фоне памятнага знака свайго населенага пункта.

Алесь Зайка расказваў гэта з гонарам за свой раён, падкрэсліваў сталасць і грамадзянскую пазіцыю мясцовай улады. Бо трэба ж было спачатку выдзеліць сродкі, паклапаціцца пра выраб названых дошак, каб на роднай мове ўвекавечыць факт першай згадкі таго ці іншага населенага пункта.

Ён сцвярджаў, што насельніцтва, асабліва моладзь, павінна ведаць гісторыю сваёй мясціны, для гэтага мусяць быць устаноўлены вось такія памятныя знакі. Былы настаўнік звычайна ішоў на прыём да кіраўніцтва мясцовай улады і знаходзіў разуменне. І сёння ў райвыканкаме адзначаюць, што ва ўсіх падзеях, звязаных з увекавечаннем гісторыі рэгіёна, ёсць вялікая заслуга краязнаўца з Заполля. Ён заўсёды быў актыўным збіральнікам, зараджаў сваёй энергіяй і любоўю іншых. Таму, відаць, і знаходзіў падтрымку.

КНІГА, ШТО ПІСАЛАСЯ 35 ГАДОЎ

Час ішоў, паяўляліся новыя кнігі. Скажам, шлях да стварэння выдання «Дыялектны слоўнік Косаўшчыны» заняў больш за тры дзесяцігоддзі. Твор быў заўважаны і ацэнены ў навуковых колах. Адразу пасля выхаду кнігі аўтару напісаў загадчык кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Танка Дзмітрый Дзятко: «Толькі той, хто мае дачыненне да мовы і мовазнаўчай навукі, можа рэальна ацаніць, колькі часу і намаганняў патрэбна прыкласці да таго, каб падрыхтаваць такое сур'ёзнае выданне».



Пасля выхаду гэтай кнігі Алеся Зайку сталі запрашаць выступіць на розных навуковых канферэнцыях, у зборніках форумаў сталі публікаваць яго даклады. Словам, навуковая супольнасць прызнала краязнаўца і збіральніка за свайго.

Тады падалося, што гэтая кніга асабліва дарагая аўтару. Тыя 4000 слоў, што ўвайшлі ў яе, Алесь Фаміч запісваў не менш за 35 гадоў. Работу пачаў яшчэ маладым настаўнікам. Любіў пагаварыць з людзьмі і прыслухоўваўся да іх гаворкі. Добра разумеў, што носьбіты мовы — гэта людзі, а яны не вечныя, паступова адыходзяць. Як і разумеў, што мілагучнае, ёмістае слова можа знікнуць, згубіцца, растварыцца і будзе заменена іншаземным, чужым. Так паявіліся першыя нататнікі. Ён стаў запісваць усё запар. Збіраліся словы, выслоўі, прыказкі, прымаўкі, легенды. Спачатку работа не мела ніякай сістэмы — проста размаўляў з людзьмі і запісваў. Прычым запісваў паўсюль, дзе толькі бываў. Па маладосці хацелася ахапіць неабдымнае, ездзіў па Беларусі на сваім «мінскім» матацыкле, размаўляў, збіраў, запісваў.

СЛОВА ЯК ЗНАХОДКА

Потым прыйшло разуменне, што замахваецца на нерэальнае, жыцця не хопіць, каб сабраць фальклорныя цікавінкі ды народную мудрасць ва ўсіх кутках Беларусі. Прыйшоў да высновы, што трэба хоць бы ў Івацэвіцкім раёне правесці краязнаўча-даследчую работу. І ўжо з сярэдзіны 1990-х гадоў паездкі сталі абмяжоўвацца выключна Івацэвіцкім раёнам. Паступова ў рабоце стала вызначацца сістэма, навуковая аснова. Паявіліся тыя самыя карткі, сшыткі, якія Алесь Фаміч мне паказваў.

Яму пашчасціла: ён застаў людзей, якія ведалі паданні, легенды сваіх мясцін. Калі апублікаваў легенду «Чаму на зямлі добрыя і ўсялякія людзі жывуць», запісаную ад Марфы Шчурко, выклікаў сапраўдны фурор сярод знаўцаў паданняў зямлі беларускай.

Да слова ён ставіўся як да знаходкі. Спачатку запісваў яго, потым пазнаваў мясціну, паходжанне і прозвішча чалавека, ад якога пачуў. Паводле пераканання збіральніка, любіць мову азначае найперш ведаць яе, зберагаць, не даць памерці. А для гэтага важна не страціць ніводнага слоўка — над гэтым і працаваў усё жыццё.

Сучасны Івацэвіцкі раён умоўна дзеліцца на тры рэгіёны: Быценшчыну, Целяханшчыну і Косаўшчыну. Кожны гэты куток адметны, своеасаблівы, непаўторны, варты пільнага вока і гісторыка, і этнографа, і мовазнаўцы. Але хто б пра тое ведаў, каб не Алесь Зайка? Дзякуючы Алесю Фамічу ўсе, мабыць, у Івацэвіцкім раёне цяпер ведаюць, што такое «запалянская валока».

Раней, аказваецца, хлопцы і мужчыны з Заполля былі вялікімі аматарамі... пабіцца. Вось і хадзілі на чужыя кірмашы з развязнай валокай — вяроўчынай, якой мацаваліся лапці. Калі хто наступіць на яе, гэта і станавілася нагодай для разборак. А вось што такое «гвозд», мала хто адразу здагадаецца, бо гэта зусім не цвік. Так у адной з вёсак Косаўшчыны называюць ігольчасты лес, а «шум» азначае ліставы лес. Памятаеце верш «Зялёны шум»? Такіх слоў у яго нататніках тысячы.

«КАБ ТЫ ВЕДАЎ, ЯК ДУША БАЛІЦЬ...»

Нястомны руплівец мовы ўсе гады не проста занатоўваў словы, ён запісваў ад старых вяскоўцаў назвы кожнага ручая, гары, поля, лесу, асобнай мясціны. І гэта таксама стала скарбам, выратаваным ад знішчэння, бо мясцовыя назвы забываюць, адыходзяць у нябыт разам з іх носьбітамі.

Яму пашчасціла: ён застаў людзей, якія ведалі паданні, легенды сваіх мясцін. Калі апублікаваў легенду «Чаму на зямлі добрыя і ўсялякія людзі жывуць», запісаную ад Марфы Шчурко, выклікаў сапраўдны фурор сярод знаўцаў паданняў зямлі беларускай. Такой легенды, як аказалася, яшчэ нідзе не было. Бо ў ёй хоць і ёсць дачыненне да біблейскіх аповедаў аб нараджэнні чалавека, але можна заўважыць і язычніцкія матывы. «Язычнікі ў нас да канца не памерлі, — смяяўся Алесь Фаміч. — Адной назіраў такую карціну: ідзе жанчына ў царкву, раптам дарогу ёй перабягае чорны кот, яна разварочваецца і крочыць дамоў. Што гэта, калі не язычніцтва?» А згаданую легенду пра розных людзей ужо пераклалі на некалькі моў.

А вось што такое «гвозд», мала хто адразу здагадаецца, бо гэта зусім не цвік. Так у адной з вёсак Косаўшчыны называюць ігольчасты лес, а «шум» азначае ліставы лес.

Недзе з канца 1990-х былы настаўнік пачаў мэтанакіравана збіраць звесткі пра гісторыю населеных пунктаў і перыядычна выступаў у раённай газеце з артыкуламі. Пра яго ведалі людзі. Аднойчы патэлефанаваў мужчына з вёскі, дзе засталося ўсяго дванаццаць чалавек. «Прыедзь, напішы пра наша сяло, — прасіў чалавек. — Мы і стол накрыем, і пачастуем. Памром — і згіне наша вёска. А каб ты ведаў, як душа баліць...»

КАЛІ САМ У СЯЛЕ, А НОГІ ЗА ГАРОЮ

Вядома ж, паехаў, напісаў і пра тую вёску. А той тэлефонны званок стаў нагодай для мініяцюры, што ўвайшла ў кнігу «Дым з коміна». Кароткія апавяданні, замалёўкі, лірычныя запісы, мініяцюры расказваюць пра землякоў аўтара. Усё тут ёсць: дасціпнасць, гумар, спрадвечная мудрасць, туга па страчаным — словам, тое, што кіношнікі часам называюць «знікаючая натура». У лірычнай замалёўцы «Чаму не спяваюць?» аўтар прыводзіць разважанне дзвюх пажылых вясковых жанчын наконт таго, як знікла песня, што суправаджала чалавека ўсё яго жыццё. І ў скрусе дадае ўжо ад сябе: «Што ж пасялілася ў душах людскіх, калі там няма месца песні? Не ведаю адказу...»

У мініяцюры «Стамленне» ўсяго тры радкі, а за імі жыццё чалавека: «Стары паляўнічы ўспамінае, смяецца: «Так, бывае, нацягаешся па лесе... Ідзеш дадому, то сам у сяле, а ногі за гарою». А ў замалёўцы «Вясёлы чалавек» расказваецца, як вясёлы і руплівы вясковец аднойчы сена згнаіў: «... Прывёз сена Хведар. Трэба закінуць на вышкі. Ён знізу падаваў, а Матруна прымала. Глядзеў Хведар, як Матруна ўверсе бліскае голымі лыткамі, цярпеў. Не вытрымаў, палез на вышкі. А тут дождж хлібнуў. У сухуткае сена». А калі дадаць, што згадалі той выпадак аднавяскоўцы за бутэлькай віна, якую купілі на ўспамін душы Хведара, то зразумела, што шчыры, сапраўдны гумар — адзін са складнікаў натуры нашага чалавека.

У ПОШУКАХ РАЮ НА ЗЯМЛІ

А яшчэ з той нашай гутаркі я назаўсёды запомніла яго: «Адзін знаёмы ляснік казаў: «Калі хочаш даведацца, як выглядае рай, ідзі ў лес з сярэдзіны красавіка да сярэдзіны мая». І заўсёды ў гэтую пару я згадваю Алеся Фаміча Зайку і тую яго карацельку, так бы мовіць, прымерваю лес да раю.

Пасля «Дыму з коміна» выйшла яшчэ адна кніга мініяцюр «Чысты чацвер». Вось некалькі замалёвак з яе. «Калі б ты расказваў пра свой сад, быццам спяваў песню, я слухаў бы цябе, радаваўся б разам з табой цудам росту, цвіцення і з'яўлення пладоў, але ж ты доўга і нудна жалішся мне на свае выдаткі, малы прыбытак з яго. Ведаеш, чалавеча, ты дарма пасадзіў сад».



І яшчэ: «Зрабіць жыццё блізкага чалавека шчаслівым... Усяго аднаго — роднае жонкі... Як цяжка...»

«На жаль, разуменне, што паслужыць другому чалавеку — ёсць найвялікшая радасць — прыходзіць на схіле жыцця».

Сваім жыццём ён, несумненна, паслужыў многім людзям. На кнігу «Дым з коміна» ў раённай бібліятэцы некалькі гадоў была чарга. Адна за адной выходзілі кнігі «Дыялектны слоўнік Косаўшчыны», «Прыказкі і прымаўкі, жарты і каламбуры, прыгаворкі і языкаломкі, вясельныя прымаўкі пры дзяльбе каравая, вітанні і зычэнні, ветлівыя і ласкавыя выразы, засцярогі і прысяганні, праклёны і адкляцці, жартоўныя праклёны і дражнілкі-кепікі, зневажанні і параўнанні, прыкметы народнага календара з Косаўшчыны».

Паводле пераканання збіральніка, любіць мову азначае найперш ведаць яе, зберагаць, не даць памерці. А для гэтага важна не страціць ніводнага слоўка — над гэтым і працаваў усё жыццё.

На жаль, у 2018 годзе Алеся Фаміча не стала, ён крышачку не дажыў да свайго 70-годдзя. Ужо пасля смерці выйшла кніга «Мікратапаніміка Івацэвіччыны», за ёй «Крыніцы і вытокі» пра Івацэвіцкі раён. І вось нядаўна ў сталічным выдавецтве «Тэхналогія» ўбачыла свет кніга «Тэматычны слоўнік прыроды Косаўшчыны», якую па запісах Алеся Зайкі склаў кандыдат філалагічных навук Мікола Даніловіч. Так што справа Алеся Фаміча жыве, і ён па-ранейшаму служыць сваім землякам.

21 чэрвеня гэтага года сесія раённага Савета прысвоіла Алесю Фамічу Зайку званне Ганаровага грамадзяніна Івацэвіцкага раёна, — сказаў **старшыня райсавета Аляксандр САРОКА.** — У пастанове гаворыцца, што званне нададзена за вялікі асабісты ўклад у развіццё краязнаўства, захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны раёна.

У гэтым месяцы на базе Косаўскай сярэдняй школы запланавана правядзенне канферэнцыі «Зайкаўскія чытанні». У рамках форуму будуць уручаны дакументы ганаровага грамадзяніна сям'і Алеся Фаміча.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дапамога

У КРАІНУ ВЕДАЎ — З ДОБРЫМ СЭРЦАМ

Напярэдадні пачатку новага вучэбнага года Беларускі саюз жанчын правёў акцыю «Збяром партфель разам» ва ўсіх рэгіёнах краіны. Аб гэтым расказала яго першы намеснік Святлана СІТНІКАВА.

— Мы аказваем дапамогу шматдзетным, няпоўным, малазабяспечаным сем'ям, сем'ям, дзе выхоўваюцца дзеці з асаблівасцямі развіцця і дзеці з інваліднасцю. Партфелі для школьнікаў папоўніліся ручкамі, алоўкамі, сшыткамі ды іншымі неабходнымі канцылярскімі прыладамі. А таксама першакласнікам перадалі адзенне і спартыўны абутак. Сем'і, якія маюць патрэбу ў дапамозе па актыўным уключэнні дзяцей у школьнае жыццё, атрымалі грашовыя сертыфікаты, канцылярскія тавары, адзенне і прысмакі на агульную суму больш за 213 тысяч рублёў. Усяго дапамога аказана 3701 сям'і, у якіх парадавалі падарункамі 12 073 дзіцяці. Акрамя таго, навінкай бягучага года стала правядзенне розных урачыстых мерапрыемстваў з удзелам дзяцей і іх бацькоў: канцэрты, спектаклі, тэатралізаваныя паказы, экскурсіі, якія прайшлі па ўсёй краіне.

Дзень ведаў традыцыйна стаў падставай для добрых спраў, падкрэсліла **начальнік Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра Яна ШАРАМЕЦЬЕВА.**

— Валанцёрскія атрады, цэнтры, установы адукацыі штогод да пачатку вучэбнага года рыхтуюць канцылярскія тавары і салодкія падарункі для дзяцей з сацыяльных устаноў, дзіцячых дамоў, педагагічных цэнтраў, інтэрнатаў і перадаюць сабраныя падарункі напярэдадні 1 верасня. Таксама валанцёры арганізоўваюць інтэрактыўныя праграмы, конкурсы для першакласнікаў. Напрыклад, валанцёрскі клуб «Слон» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў распрацаваў інтэрактыўную праграму, падчас якой хлопцы і дзяўчаты дапамагаюць Бураціну трапіць у Краіну ведаў. У сталічнай школе № 56 супрацоўнікі Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра разам з настаўнікам правялі для першакласнікаў урок аб валанцёрстве, дапамозе родным і блізкім, клопаце пра сваю краіну і горад і прэзентавалі кнігу «Падарожжа ў Краіну Добрых Спраў», якую распрацаваў наш цэнтр, каб паказаць, што добрыя справы здольны здзяйсняць кожны.

Дабрачынная акцыя «Збяром дзяцей у школу» Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа прадоўжыцца да 30 верасня. Аб гэтым расказаў яго **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Кацярына ШАРШУНОВА.**

— Аказваем падтрымку сем'ям, якія знаходзяцца ў хісткім становішчы і дапамагаем сабраць канцылярыю, школьную і спартыўную форму, іншыя прылады для школьнікаў. Такую дапамогу ўжо атрымалі больш за 2347 дзяцей, большасць з якіх — з маламаёмных і шматдзетных сем'яў. Зараз сабрана больш за 15 тысяч рублёў пад такія патрэбы. Сёлета мы паспрабавалі новы фармат аказання дапамогі: у Брэсце і Баранавічах даём сертыфікаты на школьныя прылады ў буйных гандлёвых цэнтрах на суму ад 20 да 50 рублёў. Гэты фармат знайшоў добры водгук сярод сем'яў, якія маюць у гэтым патрэбу. Таксама мы закупляем і дорым канцылярскія наборы і школьную форму карэкцыйным і сацыяльна-педагагічным цэнтрам краіны, у Мінску — дзіцячаму дому-інтэрнату для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Да канца нашай кампаніі плануем аказаць дапамогу больш чым сямі тысячам дзяцей.

З 2013 года Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі рэалізоўвае дабрачынны праект «У школу з добрым сэрцам». Падрабязней расказала **сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, старшыня Цэнтральнага савета ГА «БРПА» Аляксандра ГАНЧАРОВА.**

— Праект традыцыйна стартаваў 3 жніўня. Валанцёры руху «Добрае сэрца» арганізоўваюць збор школьнага адзення і абутку, канцылярскіх прылад, вучэбных дапаможнікаў, спартыўных тавараў і іншых рэчаў, неабходных дзецям з маламаёмных сем'яў для падрыхтоўкі да вучобы. Кожная рэгіянальная структура БРСМ праводзіць гэтымі днямі акцыі і гульнявыя праграмы для школьнікаў. Таксама аказваем дапамогу ўстановам адукацыі па падрыхтоўцы будынкаў да новага вучэбнага года. Мінская гарадская арганізацыя БРСМ выступіла з ініцыятывай дапамогі ў падрыхтоўцы сталічнай школы № 224. Калі традыцыйна праект доўжыўся да 3 верасня, то цяпер — да 6 верасня. Радуе, што ўсё больш і больш маладых людзей далучаецца да добраахвотніцкага руху.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Здаровы падыход

Што б такога з'есці, каб арганізму карысць прынесці?

Правільнае харчаванне дапамагае школьніку вучыцца

Школьны ўзрост — час фізічнага, інтэлектуальнага, маральнага станаўлення і актыўнага развіцця дзіцяці. Сёння школьнікі вымушаныя «перапрацоўваць» усё большы ціск інфармацыйнай плыні, які ўздзейнічае на іх не толькі ў школе, але і дома. Дадатковай нагрузкай на дзіцячы арганізм, акрамя школьнай праграмы, з'яўляюцца заняткі ў гуртках і спартыўных секцыях, таму вельмі важна, каб харчаванне дзяцей было збалансаванае і здаровае. Пра тое, як дамагчыся гэтага, расказалі дыетолаг Надзея ЛІТВІНАВА і дырэктар камбіната школьнага харчавання г. Мінска Надзея ЛУКАШЭВІЧ.

У ВЫЗНАЧАНЫЯ ГАДЗІНЫ

Многія бацькі лічаць, што ў справе харчавання школьніка галоўнае — даверыцца ўласнай інтуіцыі і здаровому сэнсу. Аднак важна ведаць і разумець прынцыпы рацыянальнага харчавання і правілы гігіены харчавання.

— Адзін з важных прынцыпаў — рэжым прымання ежы, — гаворыць дыетолаг. — Добраму апетыту, лепшаму стравараванню і засваенню ежы спрыяюць колькасць яе прыёмаў, інтэрвалы паміж імі, размеркаванне харчовага рацыёну па энергакаштоўнасці і хімічным саставе, прадуктовы набор і нават маса ежы. А харчаванне ў вызначаныя гадзіны дапамагае паўнавартаснаму засваенню і прадухіляе страўнікава-кішачныя захворванні.

Па нашай просьбе дыетолаг вызначыла некалькі правілаў рацыянальнага харчавання:

✓ харчавацца 4-5 разоў на дзень;

✓ выключыць незапланаваныя перакусы паміж асноўнымі прыёмамі ежы;

✓ перапынак паміж сняданкам і абедам, абедам і вячэрай павінен складаць 4-5 гадзін, інтэрвал паміж вячэрай і адыходам да сну — 3-4 гадзіны;

✓ харчавацца лепш у строга ўстаноўленыя гадзіны, гэтае правіла адыгрывае вялікую ролю ў фарміраванні ўмоўна-рэфлекторных рэакцый (выдзяленне сліны, страўнікавага соку);

✓ працягласць прыёму ежы не павінна быць меншай за 20-30 хвілін;

✓ важна старанна і не спяшаючыся перажоўваць ежу;

Сур'ёзнага павышэння цэн на школьныя абеды не чакаецца, і на кашальках бацькоў навінкі меню асабліва не адаб'юцца.

✓ есці трэба ў камфортнай абстаноўцы, не адцягваючы ўвагу на гаджэты ці кнігі. Рэкамендаванае размеркаванне энергетычнай каштоўнасці рацыёну пры чатырохгадзінным харчаванні: сняданак — 25 %, другі сняданак ці падвячорак — 20 %, абед — 35 %, вячэра — 15-20 %.

Што датычыцца збалансаванасці і гарманічнасці саставу рацыёну па ўсіх харчовых кампанентах (бялкі, тлушчы, вугляводы, мікранутрыенты), то ўтрыманне бялкоў, тлушчаў і вугляводаў варта падтрымліваць у суадносінах прыкладна 1:1:4. Утрыманне раслінных і жывёльных бялкоў павінна быць у суадносінах 2:3, а тлушчы — пераважна раслінныя. У харчаванні абавязкова павінны прысутнічаць разнастайныя малочныя, мясныя, рыбныя, яечныя стравы, гародніна, садавіна, арэхі, алей.

Яшчэ адным важным прынцыпам харчавання з'яўляецца беражлівая кулінарная апрацоўка, якая забяспечвае мікранутрыентную захаванасць прадуктаў пры прыгатаванні страў (запяканне, варэнне, гатоўка на пары), абмежаванне або выключэнне смажання і прыгатавання ў фрыцюры.

Гатаваць для дзяцей лепш са свежых прадуктаў з захаваннем сезоннасці, можна выкарыстаць і свежазамарожаныя інгрэдыенты.

КАШЫ — НАША ЎСЁ!

Самая распаўсюджаная памылка, на думку спецыяліста, — прапусканне сняданку.

— У адпаведнасці з апошнімі даследаваннямі ў тых, хто не прапускае сняданак, працэс абмену рэчываў адбываецца ў сярэднім на 7 % хутчэй, — гаворыць Надзея Літвінава. — А той, хто рэгулярна прапускае сняданкі, адпаведна запавольвае працэс абмену. Умела падабраны сняданак іграе важную ролю ў жыцці і здароўі дзіцяці і перашкаджае назапашванню лішняй вагі. Сняданак павінен быць лёгкі. А найлепшай крыніцай энергіі для мозга з'яўляецца прыём ежы, багаты на складаныя вугляводы, а гэта кашы.

Яшчэ адной памылкай дыетолаг лічыць даваць дзіцяці для перакусу прадукты, якія складаюцца з простых вугляводаў: цукеркі, шакалад, вафлі і іншыя прысмакі. Яны зусім не падыходзяць для паўнавартаснага перакусу. Паспрабуйце прапаноўваць дзіцяці карысную альтэрнатыву: яблычную пасцілу, цукеркі з арэхаў і сухафруктаў. Вядома, што ў сухафруктах таксама шмат цукру, але гэты факт згладжваецца павышаным утрыманнем у іх карысных макра- і мікраэлементаў, такіх як калій, хром і нават жалеза.

Даволі сур'ёзнай праблемай дыетолаг лічыць і дэфіцыт ўжывання бялку дзецьмі. Пратэіны патрэбныя ўсім, бо гэта будаўнічы матэрыял для клетак. У адрозненне ад тлушчаў і вугляводаў пратэіны не назапашваюцца ў арганізме. Дэфіцыт бялку — найбольш частая прычына зніжэння працаздольнасці, настрою і з'яўлення слабасці. Таму важна ўключаць у рацыён дзяцей бялкі, напрыклад белае і чырвонае мяса, рыбу. Але не забывайце і аб раслінных пратэінах, такіх як грэчка, шпінат, брусельская капуста.

Нярэдка бацькі, стаміўшыся на рабоце, вячэраюць дома паўфабрыкатамі. Гэта сапраўды зручна, бо для іх прыгатавання патрабуецца зусім няшмат часу. Але ў такой ежы ёсць вялікі мінус — высокая каларыйнасць. Апошняе тлумачыцца тым, што вытворца часцей за ўсё дадае ў паўфабрыкаты субпрадукты, тлушч і абрэзкі, а гэта ўсё нездаровае, асабліва для дзяцей.

Таксама Надзея Літвінава лічыць недахопам грэбаванне гароднінай, садавіной і ягадамі. Яны — крыніца вялікай колькасці вітамінаў, мікраэлементаў і клятчаткі.

— Большасць сезонных прадуктаў — лёгкая для засваення і падыходзіць для здаровага харчавання, — кажа дыетолаг. — Рэкамендавана штодня ўжываць не менш за 300 грамаў садавіны і 400 грамаў гародніны.

РАПСАВЫ РОЎНА АЛІЎКАВЫ

Дарэчы, калі гаварыць аб харчаванні ў нашых школьных сталовых, то спецыялісты камбіната школьнага харчавання якраз распрацавалі меню для дзяцей з улікам сезоннасці, карысці і смаку.

— Меню фарміруецца абавязкова з улікам сезоннасці, — расказвае дырэктар камбіната школьнага харчавання. — І яно будзе мяняцца кожную чвэрць. Летам мы займаліся распрацоўкай меню на першую чвэрць, а гэта восеньскі перыяд, калі ёсць шмат сезоннай гародніны. Таксама мы ўключылі рапсавы алей у запраўкі і прыгатаванне страў, які лічыцца вельмі карысным, бо аналагічны аліўкавому.

Новае школьнае меню атрымала высокую адзнаку цэнтра гігіены і з першага верасня будзе прымяняцца ў школах. На другую чвэрць мы будзем разглядаць новае меню, унясём карэктывы і прыбяром з меню непапулярныя стравы. Наша задача — стаць больш гібкімі, для таго каб маленькія беларусы хадзілі ў школьную сталовую з задавальненнем.

А вось з сабой ежу, на думку спецыяліста, даваць дзецям не варта, таму што незразумела, што здарыцца з прадуктамі пры захоўванні ў цёплым класе. Сёлета ў школьных сталовых будзе прадстаўлена ў шырокім асартыменце не толькі гарачае харчаванне. Калі ў дзіцяці ёсць жаданне падсілкавацца, можна купіць што-небудзь у буфеце: прадукцыю туды падвозіць больш за сто пастаўшчыкоў, і прадукты дазволены санстанцыяй, то-бок дзіця ў школьнай сталовай не знойдзе газіроўкі і чыпсаў. Гэта будуць не толькі прысмакі, але і агароднінныя салаты, памідоркі чэры, яблычкі або любыя іншыя карысныя прадукты, якімі зручна перакусіць. Усё будзе ўжо мытае, тым больш што пры ўваходзе ў сталовую дзіця можа таксама памыць рукі і спакойна паесці за сталом.

«Умела падабраны сняданак іграе важную ролю ў жыцці і здароўі дзіцяці і перашкаджае назапашванню лішняй вагі».

Надзея Лукашэвіч запэўніла, што сур'ёзнага павышэння цэн на школьныя абеды не чакаецца, і на кашальках бацькоў навінкі меню асабліва не адаб'юцца. Застаецца растлумачыць дзецям, чаму харчавацца правільна — гэта неабходнасць, а не самадурства дарослых.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Добрыя справы

Кулінарыя і сад для... рэабілітацыі

Добрым падарункам для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія пражываюць у Лепельскім раёне, стануць кулінарная і садоўніцкая майстэрні цэнтра сацыяльна-працоўнай, сацыяльна-бытавой і фізічнай рэабілітацыі інвалідаў. Адкрыццё запланавана на 3 верасня — у рамках святкавання Дня горада ў Лепелі.

Майстэрні створаны дзякуючы сумесным намаганням Лепельскага раённага выканаўчага камітэта, міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «ЭкаБудаўнік» і дабрачыннай арганізацыі Heim-statt Tschernobyl e.V. (Германія). Гуманітарны праект пры фінансавай падтрымцы нямецкага Федэральнага міністэрства па эканамічным супрацоўніцтве ажыццяўляецца з мая 2019 года, удакладнілі «Звяздзе» ў райвыканкаме. Яго мэта — паляпшэнне якасці і пашырэнне спектра сацыяльных паслуг для людзей з інваліднасцю з дапамогай умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Лепельскага раёна».

У рамках рэалізацыі праекта і пабудавалі будынак кулінарнай і садоўніцкай майстэрань. У планах — узвядзенне Цэнтра сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі, навучання, пражывання інвалідаў і часовага прытулку. Яго ўвод у эксплуатацыю намечаны на 2022 год.

Праект мае высокую грамадскую значнасць для рэгіёна ў цэлым, паколькі будаўніцтва названых аб'ектаў павысіць даступнасць абслугоўвання інвалідаў (у тым ліку і з сельскай мясцовасці) у аддзяленні дзённага знаходжання, падкрэслілі ў райвыканкаме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Здароўе

«ЧОРНЫ ЖЭМЧУГ» ШУКАЙЦЕ Ў НЫРКАХ

Як экспертыза дапамагае ў лячэнні мочакаменнай хваробы

Згодна са статыстыкай, амаль кожны трэці пацыент уралагічных стацыянараў пакутуе на ныркова-каменную хваробу. Цвёрдыя крышталічныя рэчывы не толькі траўміруюць тканіны органаў, але могуць перакрыць мачаточнік, што прывядзе да поўнага адказу работы ныркі. Выхад адзін — выдаліць іх з арганізма. Камяні выходзяць як самастойна, так і праз хірургічнае ўмяшанне. Здаецца, праблема вырашана. Але ёсць верагоднасць, што працэс паўторыцца. Для таго каб засцерагчыся ад рэцыдыву, трэба ведаць хімічны склад свайго «брыльянта». Як расказала намеснік начальніка ўпраўлення лабараторных даследаванняў рэчавых доказаў біялагічнага характару ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гродзенскай вобласці Святлана МІЗЯНКОВА, такі аналіз набывае ўсё большую запатрабаванасць.

Даследаваць нырковыя камяні ў Гродне пачалі пяць гадоў таму. Да гэтага падобны хімічны аналіз праводзілі толькі ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі ў Бараўлянах. Новая магчымасць выклікала інтарэс у гродзенцаў. Чаму? Як аказалася, вынікі аналізу дапамагаюць урачам-уролагам разабрацца ў прычынах мочакаменнай хваробы і падабраць пацыенту адпаведную дыету. Бо мала хто хоча зноў перажыць пакуты нырковых колікаў. А між тым рэцыдывы здараюцца ў 70 % пацыентаў.

Штогод тут робяць да ста аналізаў хімічнага складу «брыльянтаў» — так некаторыя называюць гэтыя камяні з-за іх цяжкай здабычы. А фарміруюцца яны, як правіла, у выніку парушэння абменных рэчываў, траўмы нырак альбо інфекцыйных захворванняў. Прадукты харчавання таксама адыгрываюць у гэтым значную ролю.

І хоць мочакаменная хвароба вядома яшчэ з часоў егіпецкіх мумій, толькі ў XX стагоддзі была даказана дыягнастычная карысць устанаўлення хімічнага складу нырковага каменя для лячэння і прафілактыкі.

Як патлумачыла Святлана Мізянкова, ёсць некалькі відаў камянёў. У першую чаргу гэта фасфаты — нерастваральныя солі фосфарнай кіслаты, а таксама аксалаты — солі шчаўлевай кіслаты. Яны адрозніваюцца і па цвёрдасці, і па трываласці, і па медыкаментознай растваральнасці. Фасфатныя і аксалатныя камяні цяжка паддаюцца растварэнню лекавымі прэпаратамі ў арганізме. Вельмі часта сустракаецца сумесная прысутнасць фасфатаў і аксалатаў. Таксама выяўляюцца ў камянях солі мачавой кіслаты — ураты. Радзей сустракаецца ксанцін. І амаль заўсёды ў склад усіх відаў камянёў увахо-дзіць кальцый.

— Усе ведаюць аб карысці кальцыю. Але не думаюць аб тым, што яго лішкі могуць назапашваць солі. Менавіта гэты кампанент — адзін з асноўных у нырковых камянях, таму не варта ўжываць яго без асаблівай патрэбы, — заўважае суразмоўніца.

Святлана Мізянкова дэманструе багатую «калекцыю» камянёў з нырак. Усе яны розныя па форме: круглыя, плоскія, з выступамі, з шыпамі. Па колеры — ад чорнага да жоўтага, памер таксама розны. Ад невялікіх крупінак да «марскіх» каменьчыкаў.

— Мы праводзім аналіз камянёў, якія выдалены хірургічным шляхам альбо выйшлі самастойна. Вядома, яны адрозніваюцца памерамі. Камень, які выходзіць самастойна, не большы, чым зерне грэчкі ці проса. Хірургічныя могуць дасягаць 2-3 сантыметраў у дыяметры. Калі іх разбіць ультрагукавым апарат на дробныя кампаненты, яны выходзяць і самастойна. Для аналізу камяні расціраем у парашок і праводзім якасную рэакцыю і мікракрышталескапію. Па відзе крышталікаў і вызначаецца склад соляў. На падставе аналізу ўрач можа даць рэкамендацыі, якія прадукты лепш ужываць, а ад якіх варта адмовіцца, — расказвае эксперт.

Напрыклад, калі камень аксалатны, варта выключыць з рацыёну шакалад, какаву, буракі, шчаўе, шпінат. Калі выяўлены ураты, нельга ўжываць у ежу шпроты, каву, бараніну, свініну. Таксама ёсць рэкамендацыі па малочных прадуктах.

Запатрабаванасць у такіх аналізах сярод насельніцтва ўзрастае, заўважае суразмоўца. Хоць гэта працэдура платная: адзін аналіз каштуе 60 рублёў. Людзі звяртаюцца як самастойна, так і па рэкамендацыі ўрачоў-уролагаў. З імі эксперты таксама праводзяць сустрэчы, каб расказаць аб сваіх магчымасцях. Дарэчы, гродзенскія судовыя эксперты распрацавалі метадычныя рэкамендацыі па даследаванні хімічнага складу ныркавых камянёў, якія ўключаны ў рэестр метадычных матэрыялаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Цяпер такія аналізы праводзяцца і на базе іншых абласных упраўленняў ДКСЭ.

Вядома, толькі аналізу хімічнага складу нырковага каменя для лячэння недастаткова. Перш чым скласці дыету, збіраецца ўвесь анамнез пацыента, усе біяхімічныя паказчыкі. Але тып каменя падкажа ўролагам, як з ім працаваць. Напрыклад, калі ў чалавека выяўлены іёны амонію, значыць, ёсць нейкі запаленчы працэс. У жанчын мочакаменную хваробу можа справакаваць цяжарнасць, таму што ідзе гарманальная перабудова арганізма. Дзякуючы даследаванням судовых экспертаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, можна не толькі карэкціраваць харчаванне пацыента, але і прызначыць лекавую тэрапію для растварэння камянёў.

— Мочакаменная хвароба памаладзела, — заўважае Святлана Мізянкова. — Раней на яе пакутавалі людзі сярэдняга і сталага ўзросту. Цяпер нямала пацыентаў, якім 30—40 гадоў. Звяртаецца больш мужчын. А самым маладым пацыентам была студэнтка 1 курса медуніверсітэта.

Здарыўся яшчэ такі выпадак. Жанчына прынесла нырковыя камяні ў слоічку з-пад крэму «Чорны жэмчуг». Відаць, ставілася да іх як да каштоўнасці. А магчыма, яе «жэмчуг» быў напамінам аб тым, што арганізм патрабуе ўважлівага стаўлення да свайго здароўя.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Крымінал, здарэнні

Зарадная прылада справакавала пажар

Такая папярэдняя версія ўзгарання ў кватэры жылога дома ў вёсцы Падгор'е Магілёўскага раёна.

— У выніку пажару ў кватэры на першым паверсе стварылася шчыльнае задымленне ў пад'ездзе, — паведаміла падраздзяленні **старшы інспектар Цэнтра бяспекі жыццядзейнасці і ўзаемадзеяння з грамадскасцю МА УМНС Аляксандра ДАШКЕВІЧ.** — Агнём былі знішчаны канапа і пасцельныя рэчы, закурана маёмасць у кватэры. Пацярпелых, на шчасце, няма. Як мяркуецца, прычынай пажару стала падключаная да электрасеткі зарадная прылада ад мабільнага тэлефона.

Ратавальнікі папярэджваюць, што ні ў якім разе нельга пакідаць без нагляду падключанай да разеткі зарадную прыладу. Скокі напружання, тэхнічныя збоі могуць справакаваць яе загаранне. Для свайго ж бяспекі выкарыстоўвайце арыгінальныя зарадкі. У час навальніцы трэба наогул адключаць зарадныя прылады ад сеткі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Ліцэіст пашкодзіў аўто з пнеўматыкі

Увечары ў Чачэрску кампанія маладых людзей праходзіла міма легкавога аўтамабіля. Пачуўся плясканч, і бакавое шкло аўто рассыпалася. Сведкам здарэння стаў супрацоўнік мясцовага РАУС.

Ён адразу выказаў здагадку, што ў каго-небудзь з хлопцаў у руках была пнеўматычная зброя. Незнаёмцы паспрабавалі збегчы, але міліцыянер здолеў затрымаць дваіх. Яшчэ аднаго злавіла гаспадыня аўто, чацвёртага знайшлі пазней.

На месца здарэння прыбыла следча-аператыўная група. Падчас агляду месца злачынства супрацоўнікі крымінальнага вышуку выявілі прадмет, падобны на пнеўматычны пісталет, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Пазней высветлілася, што маладыя людзі прыехалі з гарпасёлка Карма ў Чачэрск на вучобу. З сабой у аднаго з іх, 16-гадовага хлопца, быў пнеўматычны пісталет. Ліцэіст вырашыў праверыць, як далёка страляе зброя. Куля трапіла ў шкло аўтамашыны, разбіўшы яго.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням непаўналетняга і распачалі крымінальную справу за хуліганства. Санкцыі артыкула прадугледжваюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ілжэмінёр — 16-гадовы падлетак

У аператыўна-дзяжурную службу УУС Гомельскага аблвыканкама паступіла паведамленне аб тым, што дом № 1 на плошчы Перамогі замініраваны.

Да месца здарэння адразу накіравалі нарады органаў унутраных спраў і іншыя экстранныя службы. У мэтах бяспекі ачапілі будынак і найбліжэйшыя тэрыторыі. Праводзілася эвакуацыя жыхароў дома.

Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы вайсковай часці 5525 унутраных войскаў МУС Беларусі праверылі памяшканні, выбуховых прылад знойдзена не было.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі, што званок здзейсніў 16-гадовы юнак, навучэнец 11 класа адной з сярэдніх школ абласнога цэнтра.

Зараз у дачыненні да гараджаніна заведзена крымінальная справа за загадзя ілжывае паведамленне аб небяспецы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Рэдкія экземпляры

Нямецкі маўзер 1939 года і вінтоўку Мосіна знайшлі ў Гродзенскай вобласці

Работнік ЖКГ пры дэмантажы даху ў г. п. Бераставіца ўбачыў прадмет, які нагадваў агнястрэльную зброю. Мужчына паведаміў аб гэтым у мясцовае аддзяленне міліцыі. Знаходка была накіравана на судовую балістычную экспертызу.

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УДКСЭ па Гродзенскай вобласці Алена МІСЮКЕВІЧ, знойдзены прадмет з'яўляецца карабінам сістэмы Маўзер, выраблены заводскім спосабам. Агнястрэльнай зброі больш чым 80 гадоў. Але, нягледзячы на стан маўзера, карозію, драпіны і пацёртасць, ён прыдатны да стральбы. Захаваліся і маркіровачныя знакі — год выпуску, заводскі нумар, мадэль, а таксама іншыя вытворчыя таўро. Як паведамілі ў экспертным ведамстве, такія мадэлі даволі рэдка трапляюць на балістычную экспертызу. Эксперты прыгадалі яшчэ адзін нядаўні выпадак. На абследаванне трапіла агнястрэльная зброя, якую пры будаўнічых работах знайшоў жыхар Гродзенскага раёна.

Аказалася, што знаходка — складаныя часткі магазінай вінтоўкі канструкцыі Мосіна ўзору 1891—1930 гадоў. Праўда, да выкарыстання па мэтавым прызначэнні яна не прыдатная.

Пры гэтым спецыялісты нагадваюць, што пры выяўленні зброі ці боепрыпасаў неабходна адразу паведаміць у праваахоўныя органы і дачакацца іх прыезду. Ні ў якім выпадку нельга браць сваю знаходку ў рукі, нават калі яна выглядае пашкоджанай альбо ржавай. І ў такім стане зброя можа быць небяспечнай.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов	**Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»**
Продавец	**ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)**

Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения

Сведения о предмете торгов и начальной цене

Дебиторская задолженность:

Лот № 1: Частное торгово-производственное унитарное предприятие «Бобровник В.В.» (УНП 490907817) на сумму 7 348,43 руб., начальная цена – 3 674,22 руб.

Лот № 2: Жлобинский хлебозавод – Филиал ОАО «Гомельхлебпром» (400173506) на сумму 7 100,00 руб., начальная цена – 3 550,00 руб.

Лот № 3: ИП Крупник Юрий Аркадьевич на сумму 728,30 руб., начальная цена – 364,15 руб.

Лот № 4: Лаврут Сергей Николаевич на сумму 9 029,56 руб., начальная цена – 4 514,78 руб.;

Лот № 5: Общество с ограниченной ответственностью «Мосты Радуги» (490614109) на сумму 1 871,39 руб., начальная цена – 935,70 руб.

Лот № 6: Частное торговое унитарное предприятие «Чаша счастья» (490980171) на сумму 319,39 руб., начальная цена – 159,70 руб.

Лот № 7: Торговое унитарное предприятие «Гомельская универсальная база» (400058629) на сумму 67 378,53 руб., начальная цена – 33 689,27 руб.

Лот № 8: Общество с ограниченной ответственностью «Господар-Экспорт» (191633079) на сумму 2 411,61 руб., начальная цена – 1 205,81 руб.

Лот № 9: Общество с ограниченной ответственностью «Господар-Экспорт» (191633079) на сумму 1 449,58 руб., начальная цена – 724,79 руб.

Лот № 10: Общество с ограниченной ответственностью «Господар-Экспорт» (191633079) на сумму 388,80 руб., начальная цена – 194,40 руб.

Лот № 11: Общество с ограниченной ответственностью «Господар-Экспорт» (191633079) на сумму 201,01 руб., начальная цена – 100,51 руб.

Лот № 12: Общество с ограниченной ответственностью «Мила Плюс Принт» (УНП 191803074) на сумму 297,77 руб., начальная цена – 148,89 руб.

Лот № 13: Общество с ограниченной ответственностью «Энерджилайф» (УНП 191446423) на сумму 353,52 руб., начальная цена – 176,76 руб.

Лот № 14: Общество с ограниченной ответственностью «КлинХаус» (УНП 191692668) на сумму 18,00 руб., начальная цена – 9,00 руб.

Лот № 18: Общество с ограниченной ответственностью «КлинСтрим» (УНП 192436934) на сумму 662,40 руб., начальная цена – 331,20 руб.

Лот № 19: Общество с ограниченной ответственностью «КлинСтрим» (УНП 192436934) на сумму 29,40 руб., начальная цена – 14,70 руб.

Лот № 20: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 13,09 руб., начальная цена – 6,55 руб.

Лот № 21: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 36,72 руб., начальная цена – 18,36 руб.

Лот № 22: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 28,95 руб., начальная цена – 14,48 руб.

Лот № 23: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 1 729,20 руб., начальная цена – 864,60 руб.

Лот № 24: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 2 216,75 руб., начальная цена – 1 108,38 руб.

Лот № 25: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 8 948,39 руб., начальная цена – 4 474,20 руб.

Лот № 26: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 16 552,92 руб., начальная цена – 8 276,46 руб.

Лот № 27: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 14,40 руб., начальная цена – 7,20 руб.

Лот № 29: Частное торговое унитарное предприятие «Контрол-Инвест» (УНП 490440110) на сумму 3 830,25 руб., начальная цена – 1 915,13 руб.

Лот № 31: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 111 669,00 руб., начальная цена – 55 834,50 руб.

Лот № 32: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 1 844,04 руб., начальная цена – 922,02 руб.

Лот № 33: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 11 840,00 руб., начальная цена – 5 920,00 руб.

Лот № 34: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 1 710,00 руб., начальная цена – 855,00 руб.

Лот № 35: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 1 058,93 руб., начальная цена – 529,47 руб.

Лот № 36: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 2 431,60 руб., начальная цена – 1 215,80 руб.

Лот № 37: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 700,00 руб., начальная цена – 350,00 руб.

Лот № 39: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 108 703,09 руб., начальная цена – 54 351,55 руб.

Лот № 40: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 6 749,31 руб., начальная цена – 3 374,66 руб.

Лот № 41: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 734,17 руб., начальная цена – 367,09 руб.

Лот № 42: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 288,00 руб., начальная цена – 144,00 руб.

Лот № 43: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 173 439,86 руб., начальная цена – 86 719,93 руб.

Лот № 44: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 5 534,76 руб., начальная цена – 2 767,38 руб.

Лот № 46: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 69,60 руб., начальная цена – 34,80 руб.

Лот № 63: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 35 824,42 руб., начальная цена – 17 912,21 руб.

Лот № 64: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 2 384,37 руб., начальная цена – 1 192,19 руб.

Лот № 67: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 7 314,24 руб., начальная цена – 3 657,12 руб.

Лот № 68: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 4 231,20 руб., начальная цена – 2 115,60 руб.

Лот № 69: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 2 774,72 руб., начальная цена – 1 387,36 руб.

Лот № 70: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 367,01 руб., начальная цена – 183,51 руб.

Лот № 71: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 1 879,85 руб., начальная цена – 939,93 руб.

Лот № 72: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 641,60 руб., начальная цена – 320,80 руб.

Лот № 73: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 348,66 руб., начальная цена – 174,33 руб.

Лот № 74: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 14 200,26 руб., начальная цена – 7 100,13 руб.

Лот № 75: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 4 822,80 руб., начальная цена – 2 411,40 руб.

Лот № 76: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 5 143,40 руб., начальная цена – 2 571,70 руб.

Лот № 77: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 1 523,95 руб., начальная цена – 761,98 руб.

Лот № 78: Закрытое акционерное общество «МВЗ Интер» (УНП 191118411) на сумму 96,00 руб., начальная цена – 48,00 руб.

Лот № 79: Закрытое акционерное общество «МВЗ Про» (УНП 790387172) на сумму 285,48 руб., начальная цена – 142,74 руб.

Лот № 80: Закрытое акционерное общество «МВЗ Про» (УНП 790387172) на сумму 200,00 руб., начальная цена – 100,00 руб.

Лот № 81: Закрытое акционерное общество «МВЗ Про» (УНП 790387172) на сумму 1 583,04 руб., начальная цена – 791,52 руб.

Лот № 83: Закрытое акционерное общество «МВЗ Про» (УНП 790387172) на сумму 4 804,76 руб., начальная цена – 2 402,38 руб.

Лот № 84: Закрытое акционерное общество «МВЗ Про» (УНП 790387172) на сумму 421,56 руб., начальная цена – 210,78 руб.

Лот № 85: Закрытое акционерное общество «МВЗ Промет» (УНП 191118452) на сумму 9,60 руб., начальная цена – 4,80 руб.

Лот № 88: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 1 975,20 руб., начальная цена – 987,60 руб.

Лот № 90: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 2 424,01 руб., начальная цена – 1 212,01 руб.
